ПРОЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

СЕРАДА, 28 ВЕРАСНЯ 1938 г. № 53 (395)

ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВ

Орган праўлення Саюза савецкіх пісьменнікаў БССР і Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР

СТАРОНКІ ГЕРАІЧНАЙ БАРАЦЬБЫ І ПЕРАМОГ

Сёння «Праўда» публікуе сёмы раздзел Кароткага курса гісторыі ВКП(б), які ахоплівае грандыёзны па сваім значэнню перыяд з красавіка 1917 года па 1918 год, перыяд, калі грымнуў гром Вялікай сацыялістычнай рэвалюцыі, калі рабочы клас у саюзе з сялянствам звергнуў гнёт капіталізма, калі быў закладзен фундамент савецкай сацыялістычнай дзяржавы.

Вогнены лозунг Леніна, кінуты на Фінляндскім вакзале ў дзень звароту ў Расію, — «Няхай жыве сацыялістычная рэвалюцыя!», знайшоў бурны водгук у сэрцах народа. Красавіцкія тэзісы Леніна, даўшыя партыі і пралетарыяту ясную рэвалюцыйную лінію пераходу ад буржуазнай рэвалюцыі да сацыялістычнай, з'явіліся сцягам барацьбы для мільёнаў людзей. Перабудаваўшы свае рады, загартаваная ў безупыннай барацьбе жалезная партыя бальшавікоў уступіла ў строй рэвалюцыі, як магутная сіла, растучая дзень ада дня. Сімпатыі рабочага класа і сялянства, сімпатыі салдацкіх мас, стомленых лютай, несправядлівай, захватніцкай вайной, якая вялася ў інтарэсах замежнага і рускага капітала, былі поўнасцю на баку бальшавікоў.

На VI з'ездзе партыі, які нацэліў партыю на арганізацыю ўзброенага паўстання, таварыш Сталін, выступіўшы з палітычнай справаздачай аб рабоце Цэнтральнага Камітэта, гаварыў:

«Мірны перыяд рэвалюцыі скончыўся, наступіў перыяд не-мірны, перыяд схватак і выбухаў...»

Выпушчаны з'ездам маніфест партыі заклікаў рабочых, салдат, сялян рыхтаваць сілы для рашучых схватак з буржуазіяй. Ён канчаўся такімі словамі:

«Рыхтуйцеся да новых баёў, нашы баявыя таварышы! Стойка, мужна і спакойна, не паддаючыся на правакацыю, збірайце сілы, страйцеся ў баявыя калоны! Пад сцяг партыі, пралетары і салдаты! Пад наш сцяг, прыгнечаныя вёскі!»

7 лістапада 1917 года бальшавікі павялі народ на штурм цвярдыні капіталізма. Ленін і Сталін асабіста кіравалі паўстаннем. Народ перамог.

Дэкрэт аб міры, дэкрэт аб зямлі, які перадаў памешчыцкія, удзельныя і манастырскія землі ў бясплатнае карыстанне прапоўных, былі першымі мерапрыемствамі Савецкай улады.

Усе спробы буржуазіі спыніць трыумфальнае шэствіе сацыялістычнай рэвалюцыі былі дарэмнымі.

Кароткі курс гісторыі ВКП(б) дае глыбокі аналіз галоўных прычын, якія вызначылі такую параўнальна лёгкую перамогу сацыялістычнай рэвалюцыі ў Расіі. Кастрычніцкая рэвалюцыя мела перад сабою такога параўнальна слабога, дрэнна арганізаванага, палітычна мала вопытнага ворага, як руская буржуазія.

«Слабая яшчэ эканамічна і поўнасцю залежачая ад урадавых заказаў, руская буржуазія не мела ні палітычнай самастойнасці, ні дастатковай ініцыятывы, неабходных для таго, каб знайсці выхад з становішча. У яе не было ні вопыту палітычных камбінацый і палітычнага абману ў вялікім маштабе, якім валодае, напрыклад, французская буржуазія, ні школы машэнніцкіх кампрамісаў вялікага размаху, якую мае, напрыклад, англійская буржуазія».

Ланцуг капіталізма быў перарваны, значыць, у самым слабым сваім звяне!

На чале Кастрычніцкай рэвалюцыі стаяў такі рэвалюцыйны клас, як рабочы клас Расіі, клас, які загартаваўся ў баях, прайшоў за кароткі тэрмін дзве рэвалюцыі і заваяваў к пярэдадню трэцяй рэвалюцыі аўтарытэт правадыра народа ў барацьбе за мір, за свабоду, за сацыялізм. Рабочы клас Расіі меў такога сур'ёзнага саюзніка ў рэвалюцыі, «як сялянская беднота, што складала велізарную большасць сялянскага насельніцтва... Наяўнасць саюза рабочага класа і сялянскай бедноты вызначыла і паводзіны сераднякоў, якія доўга хісталіся і толькі перад Кастрычніцкім паўстаннем павярнуліся, як трэба, у бок рэвалюцыі, далучыўшыся да сялянскай бедноты.

Няма чаго і даказваць, што без такога саюза Кастрычніцкая рэвалюцыя не магла-б перамагчы».

На чале рабочага класа стаяла такая, выпрабаваная ў палітычных баях, партыя, як партыя бальшавікоў. Кастрычніцкая рэвалюцыя пачалася ў разгар імперыялістычнай вайны, калі галоўныя буржуазныя дзяржавы былі расколаты на два лагеры і не маглі актыўна выступіць супроць Кастрычніцкай рэвалюцыі.

Вялікая сацыялістычная рэвалюцыя разбурыла рэшткі саслоўнага ладу і рэжым нацыянальнага гнёту. Савецкая ўлада ліквідавала контррэвалюцыйны друк і контррэвалюцыйныя арганізацыі, распусціла буржуазны Устаноўчы сход, нацыяналізавала ўслед за зямлёй усю буйную прамысловасць, анулiравала кабальныя замежныя пазыкі і вывела краіну з становішча вайны.

Пасля заключэння цяжкога брэсцкага міру, з'яўляўшагася, аднак, неабходнай умовай для перадышкі і разгортвання творчай работы, Ленін пісаў:

«Нязносна цяжкія ўмовы міру. А ўсё-такі гісторыя возьме сваё... За работу арганізацыі, арганізацыі і арганізацыі. Будучыня — не гледзячы на ніякія іспытанні — за намі» (**Ленін, т. XXII, стар. 288**).

Перадышка была выкарыстана партыяй для таго, каб арганізаваць сілы рэвалюцыі. Калі інтэрвенты 14 дзяржаў і рускія белагвардзейцы рушылі свае полчышчы супроць маладой Савецкай рэспублікі, яны сустрэлі жорсткі адпор. Народ пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна адстаяў сваю свабоду і заваяванні Вялікай Сацыялістычнай рэвалюцыі.

Кароткі курс гісторыі ВКП(б) паказвае шлях здрады капітулянтаў і апартуністаў — Зіноўева, Каменева, Рыкава, Бухарына, Троцкага, Пятакова, якія сталі злейшымі ворагамі рэвалюцыі, чорнымі здраднікамі, агентамі фашызма, наёмнымі шпіёнамі і забойцамі.

Каменеў, Рыкаў і Пятакоў прынялі ў штыхі красавіцкія тэзісы Леніна. На красавіцкай канферэнцыі Каменеў і Рыкаў выступілі з заявай, паўтараючы меншавіцкія зады, што Расія не выспела для сацыялістычнай рэвалюцыі, што ў Расіі магчыма толькі буржуазная рэспубліка. Зіноўеў на гэтай канферэнцыі таксама выступіў супроць Леніна па пытанню аб тым, ці заставацца бальшавіцкай партыі ў цымервальдскім аб'яднанні, ці стварыць новы Інтэрнацыянал. На VI з'ездзе партыі Бухарын, знаходзячыся на трацкісцкіх пазіцыях, сцвярджаў, што сяляне знаходзяцца ў блоку з буржуазіяй і за пралетарыятам не пойдуць. Каменеў, Рыкаў і Троцкі на гэтым-жа з'ездзе здрадніцка настойвалі на тым, каб Ленін, які знаходзіўся ў падполлі, з'явіўся на суд контррэвалюцыі. Каменеў і Зіноўеў на гістарычным пасяджэнні ЦК партыі 10 кастрычніка выступалі супроць рашэння аб узброеным паўстанні, а некалькімі днямі пазней надрукавалі ў меншавіцкай газеце «Новая жизнь» сваю заяву, у якой раскрылі перад ворагамі рашэнне ЦК аб паўстанні, што з'яўлялася прамой здрадай. У часе перагавораў з немцамі ў Брэст-Літоўску Троцкі па-здрадніцку парушыў прамыя дырэктывы бальшавіцкай партыі, адмовіўшыся падпісаць дагавор і заявіўшы: «не мір і не вайна», што было толькі на-руку германскім імперыялістам.

Здраднікі, пранікшыя ў партыю і спрабаваўшыя падрываць яе магутнасць знутры — Бухарын і яго супольнікі, іменаваўшыя сябе для маскіроўкі «левымі комуністамі», сумесна з Троцкім і «левымі» эсэрамі — яшчэ ў 1918 годзе былі ў тайным загаворы супроць савецкага ўрада, паставіўшы перад сабой мэту сарваць Брэсцкі дагавор, арыштаваць Леніна, Сталіна, Свердлова, забіць іх і сфарміраваць новы ўрад з бухарынцаў, трацкістаў і «левых» эсэраў.

Так дзейнічалі гэтыя гнусныя здраднікі, надзеўшыя на сябе маску рэвалюцыянераў.

Кароткі курс гісторыі ВКП(б) яшчэ раз паказвае на гістарычных прыкладах, як трэба быць пільным, як трэба свята берагчы чыстату партыйных радоў, як трэба быць бязлітаснымі да ўсіх, хто падымае руку на партыю.

«Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя — гаворыцца ў сёмым раздзеле Кароткага курса гісторыі ВКП(б), — разбіла капіталізм, адняла ў буржуазіі сродкі вытворчасці і ператварыла фабрыкі, заводы, зямлю, чыгункі, банкі — ва ўласнасць усяго народа, ў грамадскую ўласнасць.

Яна ўстанавіла дыктатуру пралетарыята і перадала кіраўніцтва велізарнай дзяржавай рабочаму класу, зрабіўшы яго, такім чынам, пануючым класам.

Тым самым Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя адкрыла новую эру ў гісторыі чалавецтва — эру пралетарскіх рэвалюцый».

Вывучэнне гэтага выдатнага перыяду ў жыцці партыі, у жыцці нашага народа, у гісторыі ўсяго чалавецтва, перыяду, насычанага грандыёзнымі падзеямі, напаўняе сэрца савецкага патрыёта, бальшавіка партыйнага і непартыйнага пачуццём гордасці за свой вялікі народ, за свой гераічны рабочы клас, за сваю слаўную, родную, стойкую, мужную комуністычную партыю, партыю Леніна—Сталіна, якая прывяла нашу бацькаўшчыну да бліскучых перамог на ўсіх франтах сацыялістычнага будаўніцтва.

«ПРАВДА».

14 верасня 1938 г.

Да XX-годдзя ленінска-сталінскага комсамола

ШТО РЫХТУЮЦЬ РАБОТНІКІ МАСТАЦТВАЎ

У падрыхтоўцы да дваццацігоддзя ленінска-сталінскага комсамола перад работнікамі мастацтваў БССР стаяць адказныя задачы. У яркай мастацкай форме трэба паказаць працоўным нашай рэспублікі, як пад кіраўніцтвам партыі Леніна — Сталіна вырасла і жыве моладзь савецкай краіны; на фоне дасягненняў савецкай улады за дваццаць год паказаць ролю комсамола ў барацьбе за перамогу сацыялізма ў нашай краіне; адлюстраваць барацьбу комсамола і ўсёй савецкай моладзі з ворагамі народа — трацкісцка-бухарынскімі і буржуазна-нацыяналістычнымі агентамі фашызма.

План мерапрыемстваў, вызначаны прадпрыемствамі мастацтва і зацверджаны Упраўленнем па справах мастацтваў пры СНК БССР, адпавядае гэтым задачам.

Усе тэатры БССР рыхтуюць спецыяльныя спектаклі, прысвечаныя ленінска-сталінскаму комсамолу, і пакажуць іх у дні слаўнай гадавіны. Разам з тым тэатры пакажуць лепшыя пастаноўкі з свайго рэпертуара.

Беларускі дзяржаўны драмтэатр пакажа «Кацярыну Жарнасек» М. Клімковіча, Тэатр оперы і балета—оперу «Міхась Падгорны» ў канцэртным выкананні і балет «Чырвонаармейская пляска» з хорам і аркестрам, Віцебскі драмтэатр — «Чалавек з ружжом» Пагодзіна, Яўрэйскі дзяржтэатр—«Сям'я Авадзіс» П. Маркіша, Тэатр юнага гледача — спецыяльную антыфашысцкую п'есу, якая адлюстроўвае барацьбу нямецкага комсамола з фашызмам—«Годы выпрабаванняў» Шабаленка,—Раймонд, Рускі дзяржтэатр — «Любоў Яравая» Трэнева і «Слава» Гусева, Тэатр музкамедыі — «Свадзьба ў Малінаўцы», кукальны тэатр — «Па шчучаму вяленню», Слуцкі калгасны тэатр «Сыны» Фіна, Палескі — «Чужы» Салаўёва, Полацкі і Рагачоўскі — «У пушчах Палесся» Я. Коласа, Барысаўскі і Бабруйскі—«Партызаны» К. Крапівы.

У фае тэатраў будуць арганізаваны фотавыстаўкі на тэму «XX год ленінска-сталінскага комсамола», якія адлюструюць удзел комсамола ў грамадзянскай вайне і сацыялістычным будаўніцтве, а таксама барацьбу замежнага комсамола з фашызмам. Калгасна-соўгасныя тэатры арганізуюць на тую-ж тэму фотавыстаўкі-перасоўкі.

З 15 кастрычніка ў тэатрах перад пачаткам кожнага спектакля выступяць акторы з чытаннем вершаў і іншых твораў, прысвечаных гадавіне комсамола.

Калектывы філармоніі і эстрады рыхтуюць канцэрты, у праграмы якіх увойдуць творы маладых савецкіх кампазітараў, комсамольцаў. Брыгады комсамольцаў і савецкай моладзі, маладыя салісты прадэманструюць на гэтых канцэртах свае веды і дасягненні выкананнем лепшых савецкіх і класічных твораў. Рад брыгад у складзе актораў філармоніі, тэатраў, студэнтаў кансерваторыі будзе накіраван для абслугоўвання раёнаў БССР.

У Менску і ў радзе раёнаў БССР будуць арганізаваны канцэрты для дзяцей сіламі выканаўцаў комсамольцаў (студэнтаў Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі, Менскага музычнага вучылішча, запрошанай брыгады студэнтаў Маскоўскай кансерваторыі).

Савецкія кампазітары БССР выпускаюць да гадавіны масавым выданнем зборнік песень беларускіх савецкіх кампазітараў.

Віцебскае мастацкае вучылішча прыўрочвае да гадавіны комсамола арганізацыю выстаўкі заліковых работ студэнтаў, якія кончылі вучылішча ў 1937—38 вучэбным годзе. У лістападзе гэта выстаўка будзе паказана працоўным Менска.

В. Д.

І ВЫСТРАЛ ТРАПНЫ

(ВЫНІКІ VI АЛІМПІЯДЫ ЧЫРВОНА АРМ

Акруговай алімпіядзе чырвонаармейскай мастацкай самадзейнасці часцей БАВА папярэднічаў доўгі перыяд упартай мастацкай работы самадзейных калектываў над сваім рэпертуарам, прагляды самадзейнасці нізавых падраздзяленняў, прагляды мастацкай творчасці калектываў часцей, алімпіяды, адбор на акруговую алімпіяду і т. д. Уся гэтая работа спалучалася з жорсткімі патрабаваннямі баявой падрыхтоўкі, праходзіўшай у нармальнай абстаноўцы, ва ўмовах выхадаў у поле. Калектывы мастацкай самадзейнасці і салісты, не адрываючыся ад баявой вучобы, стваралі пад кіраўніцтвам камісараў часцей і паліторганаў, пры садзейнічанні партыйных арганізацый, сваё мастацтва, павышаючы яго якасць. Галоўная вартасць самадзейнасці часцей гэтага года ў тым, што яна развівалася побач з ростам баявых якасцей часці і падраздзялення, садзейнічаючы баявой гатоўнасці і ўмацаванню маральных якасцей асабовага складу часцей.

Паліторганы ў сваёй штодзённай рабоце аддавалі пытанням мастацкага выхавання байца і камандзіра велізарную ўвагу, і гэта забяспечыла рост самадзейнасці і ператварэнне яе ў магутны сродак выхавання патрыятычных пачуццяў і здаровага, мастацкага густу. Рэпертуар усіх, без выключэння, самадзейных калектываў і асобных выканаўцаў актуальны, востры, палітычна баявы. Энтузіязм удзельнікаў самадзейнасці, іх працаздольнасць стаялі на вялікай вышыні.

У VI акруговай алімпіядзе ўдзельнічала да 1500 чалавек — членаў мастацкіх калектываў, салістаў і зацейнікаў. Значную частку ўдзельнікаў склалі камандзіры і іх жонкі. Скрозь і ўсюды ў мастацкай творчасці ўдзельнічаюць асобы старэйшага комначсклада. Гэта яркае сведчанне вялікага жадання байцоў, камандзіраў і баявых сябровак камандзіраў удзельнічаць у актыўнай грамадскай рабоце.

Удзельнікі алімпіяды прадэманстравалі дзесяткі рознастайных жанраў мастацкай творчасці. Хоры, струнныя аркестры, джазы, самадзейныя музыкальныя калектывы, чцяцы, зацейнікі, спевакі і спявачкі ў спаборніцтве за першынства выраслі ў цудоўныя, цікавыя, арыгінальныя ансамблі.

Культура змешаных двухгалосых і чатырохгалосых хораў знайшла шырокае развіццё ў часцях БАВА. Пераможцамі алімпіяды аказаліся тры хоры, прычым у двух з іх кіраўнікі здольныя актывісты, якія вылучыліся з масы ўдзельнікаў самадзейнасці.

Хор часці ваенкома т. Бромберга (кіраўнік-студэнт Белдзяржкансерваторыі Грыгор'ева), заняўшы першае месца на алімпіядзе па групе змешаных хораў, паказаў выдатную вакальна-харавую культуру. У яго выкананні цудоўна прагучала «Песня пра Сталіна» Рэвуцкага на ўкраінскай мове (тэкст М. Рыльскага), «Казачы хор» з «Паднятай цаліны» і рад рускіх народных песень, выкананых у чатырохгаласавым складзе. Хор часці ваенкома тав. Бабкіна, кіруемы капельмайстрам тав. Дзегцярэнкам, узорна выканаў складаны твор кампазітара А. Александрава «Песню пра Сталіна» і некалькі народных песень. Заняўшы трэцяе месца на алімпіядзе, хор, кіруемы малодшым камандзірам тав. Андрэевым, паказаў выдатную зладжанасць і працаздольнасць.

У гэтым годзе ў мастацкай самадзейнасці часцей прывіліся мужчынскія харавыя калектывы — хоры чырвонаармейскай песні і танца. Хор чырвонаармейскай песні, прадстаўлены кіраўніком чырвонаармейцам тав. Булаевым у аб'яднанні з домравай групай пад кіраўніцтвам чырвонаармейца тав. Крыкіна, даказаў, што работа чырвонаармейскага хора можа быць даведзена да філіграннай аддзелкі. «Казачая дума аб Сталіне» — апрацоўка Калеснікава, рускія народныя песні ў апрацоўцы праф. Александрава: «Дуня», «Мяцеліца», «Всю то я вселенную проехал» і «Во поле березонька стояла» хорам былі выкананы майстэрска. Хор данской казачай песні (кіраўнік казак тав. Чэрвякоў) і хор часці ваенкома тав. Капельнік (кіраўнік тав. Бальцэвіч) прадставілі сабой вялікую цікавасць. Усе тры мужчынскія харавыя калектывы з'яўляюцца пераможцамі алімпіяды.

Не малую цікавасць уяўлялі на алімпіядзе жаночыя вакальныя ансамблі. Пераможцам першынства аказаўся хор баявых сябровак часці ваенкома тав. Васічкіна, пад кіраўніцтвам т. Сеўскага, паказаўшы культуру выканання як савецкага, так і класічнага рэпертуара. Гэты калектыў удзяліў вялікую ўвагу развучванню гераічных песень грамадзянскай вайны, якія з поспехам выканаў на алімпіядзе.

Змешаныя самадзейныя хоры-аркестры ў бягучым годзе дасягнулі вялікай зладжанасці, сыгранасці — дэманструючы вакальнае майстэрства, музыку, пляску і мастацкае чытанне. Хор-аркестр пад кіраўніцтвам капельмайстра тав. Нахшын меў на алімпіядзе выключны поспех. Склад яго—80 чалавек; ён уключае ў сябе духавую групу, скрыпачоў, хор, ударныя інструменты, салістаў, вакалістаў, чцяцоў і плясавую групу. Рэпертуар яго—цэлая канцэртная праграма і ў першую чаргу баявыя песні Чырвонай Арміі, народныя плясавыя мелодыі. Музыкальны мантаж «Комсамольская пагранічная», «Терская казачая» — Пакраса, народная ўкраінская песня «Кіну кужаль на паліцу» — асабліва добра выконваемая гэтым надзвычай змястоўным і багатым па рэпертуару калектывам.

З інструментальных джаз-аркестраў на алімпіядзе занялі першае і другое месца калектывы капельмайстра тав. Краснова і лейтэнанта тав. Шкурына; у іх рэпертуары — песні савецкіх кампазітараў. У джазе тав. Краснова вялікую мастацкую каштоўнасць прадставіла салістка вакальнага

... таварышам Гонці; калектыў часці ваенкома таварыша Громава; «Гапак» — пад кіраўніцтвам жонкі камандзіра тав. Грышынай. Па калектывах чырвонаармейскіх танцаў выйшлі на першыя месцы танцавальны калектыў танкістаў — кіраўнік лейтэнант тав. Галінскі і танцавальны калектыў, кіруемы чырвонаармейцам тав. Дрэчыным.

Сілу сваіх талентаў разгарнулі ва ўсю шырыню на алімпіядзе спевакі: ветурач тав. Пічугін (бас), які выканаў «Песню варажскага гасця» Рымскага-Корсакава і арыю Руслана з оперы «Руслан і Людміла» Глінкі; ветурач тав. Клюеў (тэнар) выканаў у выдатнай школе «Песеньку герцага» Вердзі і «Раманс Надзіра» — Бізэ.

Па камернаму жаночаму спеву выдатны клас вакала паказалі жонкі камандзіра тав. Лігвінава (каларатурнае сапрана),—«Салавей» Аляб'ева і тав. Фашчэнка (лір. драм. сапрана). — «Калыбельная пагранічная» — А. Новікава.

З асаблівым поспехам выступала на алімпіядзе выканаўца рускіх народных прымітываў — песень, жонка камандзіра тав. Валасевіч.

Ваенны інжынер таварыш Кулікаў і малодшы камандзір Астаф'еў, выканаўшыя зацейна-песенны дуэт «Волжскія песні пад саратаўскую гармонь», і частушачнік — гарманіст ваентэхнік Казлоў не мелі роўных сабе выканаўцаў.

Аркестр гарманістаў пад кіраваннем тав. Матухненкі і хор балалаечнікаў-артылерыстаў (кіраўнік тав. Сасулін) — у складзе 60 чалавек паказалі высокую культуру ансамбля народных інструментаў.

Квартэт баяністаў пад кіраўніцтвам малодшага камандзіра Жыранава, рад баяністаў-віртуозаў, балалаечнік малодшы камандзір тав. Ліпкін, жонка камандзіра скрыпачка тав. Зубкова прадэманстравалі выдатную тэхніку выканання.

Выканаўцы рытмічных танцаў: жонка камандзіра тав. Ознобішына і чырвонаармеец тав. Талеў, малодшыя камандзіры тт. Вуколаў і Маркаў; выканаўца цыганскіх танцаў малодшы камандзір тав. Купрын і рад іншых могуць быць аднесены да групы лепшых танцораў і плясуноў ак-

тав. ...

Па спартыўнай гі... першае месца зме... акрабатычная група... тав. Хантэева і гру... рабатаў, кіруемая... тав. Мірочыцкім.

Выканаўцы маста... алімпіядзе вялікую... месцы занялі: жонк... Курыліна («Паэма а... зырына), малодшы к... пенка («Камісар Уса... скога), чырвонаарме... («Прамова дэпутата... та» В. Лебедзева-Ку...

Удзельнікі алімпія... лікую работу па аб... цоў і комначскладу... зона: эстрадна-сама... дамі ў часцях і ка... 100 лятучых канцэрт... клубах часцей і ра... Менска 10 вялікіх... ны тры акруговыя... канцэрты.

Мастацкая творчас... скіх калектываў ідзе... ростам гераічнай Чы... мадзейны актыў Чы... адзін з лепшых атра... роднай творчасці кр... вялікай радзімы, кві... кім сонцам Сталінск... Магутная сіла самад... што яна ўздымае ба... ўмацоўвае сілу непа... армейскіх калон песн... раджае моцныя пачу... ці ў баі, вясёласці... разам з штыхом і к... будучых баях дабіць... куль ён прыйдзе на... вейшую ў свеце краі...

БАВА, стоячы на... ных граніц савецкай... грозную для ворагаў... на ўмацоўвае высокім... датнай творчасці а... часцей.

ДА НОВАГА ТЭАТРАЛЬНАГА СЕЗОНА

Новы сезон узбагаціць наш рэпертуар

У верасні 1937 года балетны калектыў Тэатра оперы і балета прыступіў да стварэння балетнага рэпертуара да адкрыцця новага тэатра. Калектыў павінен быў падрыхтаваць два балеты «Лебядзінае возера» і «Бахчысарайскі фантан», якія рыхтаваліся ў выключна цяжкіх умовах,—не маючы памяшкання для рэпетыцый. Зацяжка будаўніцтва тэатра ў сезоне 1937—38 гг. прымусіла абмежавацца паказам толькі часткі прапрацаванай работы ў малапрыгодным для балетнага спектакля па сваіх размерах памяшканні Яўрэйскага тэатра, малыя памеры якога, не дазволілі рэалізаваць перад гледачом усёй прапрацаванай работы.

Балетны калектыў ажыццявіў указаныя пастаноўкі і рыхтаваўся да работы над балетам «Салавей» паводле аповесці Зм. Бядулі — музыка М. Е. Крошнера. Шмат увагі ўдзялялася штодзённым трэнажным заняткам, якія ахоплівалі ўсіх работнікаў і к канцу сезона далі вялікія рэзультаты ў адносінах кваліфікацыйнага росту.

Да адкрыцця новага тэатра балетны калектыў рыхтуе балет «Салавей», — пастаноўка балетмайстра Ф. В. Ляпухава. Будзе перанесены на вялікую сцэну балет «Лебядзінае возера» (пастаноўка К. А. Мулера) які перш будзе паказаны на малой сцэне Яўрэйскага тэатра. Будзе пастаўлены балет «Бахчысарайскі фантан» (музыка Асаф'ева, пастаноўка К. Я. Галейзоўскага. Балетны калектыў удзельнічае ў радзе оперных спектакляў, як у оперы «Міхась Падгорны» (музыка Цікоцкага), «Дрыгва» (музыка Багатырова), «Русалка» (музыка Даргамыжскага) і іншых.

К. МУЛЕР,
галоўны балетмайстар Дзяржаўнага тэатра оперы і балета БССР.

ПРАЦАВАЦЬ З ВЯЛІКІМ НАТХНЕННЕМ

Мінулы сезон 1937—38 гг. для мяне, маладога актора, кончыўшага Ленінградскае тэатральнае вучылішча, даў вельмі многа. Чатырохгадовыя, некаторыя навыкі ў авалоданні акцёрскім майстэрствам у вучылішчы былі замацаваны творчым ростам на сцэне Тэатра юнага гледача. Лепшай работай мінулага сезона для мяне, маладога актора, была і застаецца роля Паўла Карчагіна ў п'есе «Як гартавалася сталь». Я ўяўляў, з якім натхненнем сустрэне савецкая моладзь звайго героя на сцэне. Таму я не шкадаваў сваіх сіл у рабоце над сцэнічным увасабленнем вобраза Паўла Карчагіна. Праіграўшы 105 спектакляў, я добра зразумеў мае добрыя і дрэнныя месцы ў спектаклі. Вельмі і вельмі многа далі мне сустрэчы ўдзельнікаў спектакля з гледачамі, асабліва на перыферыі. Мне здаецца, што такія сустрэчы трэба рабіць не па-кампанейску, як гэта ў нас бывае, а праводзіць сістэматычна. Дзве наступныя работы ў мінулым сезоне — дыверсант Лазіцкі «Наша зброя» і ўрач-шкоднік Стаwоўскі «Ноч у верасні» Для нас, актораў, зусім ясна, што як адмоўныя, так і станоўчыя персанажы павінны жыць на сцэне сапраўдным, поўнакроўным жыццём, да чаго я і імкнуўся ствараючы гэтыя ролі.

Рыхтуючыся, як і ўвесь шматмільённы комсамол нашай радзімы, да дваццацігоддзя ленінска-сталінскага комсамола, наш тэатр рыхтуе спектакль аб лепшых сынах нямецкага комсамола.

У маёй рабоце над вобразам комсамольца-падпольшчыка Курта Шэнгер я хачу паказаць мужнасць і барацьбу гераічнага комсамольца супроць азвярэлага фашызма, адданасць справе рэвалюцыі. «Годы выпрабаванняў» — так завецца гэтая п'еса, прысвечаная гераічнай барацьбе нямецкага комсамола. Увесь калектыў ахоплены адною думкай—стварыць яркі спектакль да знамянальнага дня 20-годдзя ленінска-сталінскага комсамола.

Гэтая дата да шмат чаго абавязвае. Таму тэатральныя крытыкі павінны быць цесна звязаны з тэатрам у часе ўсёй работы над спектаклем, каб разам з крытыкай, разам з комсамольскім актывам стварыць спектакль, варты ўвагі нашых гледачоў, варты выдатнага 20-годдзя ленінска-сталінскага комсамола.

Л. М. ФРЫДМАН,
актор Тэатра юнага гледача.

КАЛГАСНЫМ ТЭАТРАМ ПАТРЭБНА ДАПАМОГА

Барысаўскі калгасны тэатр існуе тры гады. За гэты час тэатр прайшоў досыць складаны шлях. Ён значна творча вырас і зараз карыстаецца заслужаным поспехам не толькі ў гледача свайго раёна, але і сумежных раёнаў, дзе паказваў свае спектаклі. Тэатр абслужвае не толькі калгаснага, але і рабочага гледача нашых раённых цэнтраў, а таксама вайсковую часць.

Рэпертуар тэатра наступны: «Партызаны» К. Крапівы, «Бацькаўшчына» К. Чорнага, «Слава» В. Гусева, «Праўда добра, а шчасце лепш» А. Астроўскага, «Пагранічнікі» Бель-Белацэркоўскага і «Гонар» Г. Мдзівані.

Асаблівага поспеху дасягнуў тэатр у мінулым сезоне, калі ў рэпертуары паявілася п'еса «Партызаны», якую тэатр паставіў да XX гадавіны Кастрычніка. Аб поспеху гэтага спектакля сведчыць тое, што ў гэтым годзе мы спадзяемся святкаваць соты яго паказ.

Наступнай удалай работай прайшоўшага сезона мы лічым «Гонар» Мдзівані. У гэтым спектаклі тэатр паказаў значны акторскі рост.

У мінулым годзе тэатр на працягу лістапада і снежня абслугоўваў раёны былой Лепельскай акругі. Тэатр наведаў самыя далёкія куткі Лепельшчыны і даў звыш 50 спектакляў для рабочых, калгаснікаў, байцоў-пагранічнікаў.

Увесну гэтага года тэатр правёў такія-ж гастролі ў Талачыне, на Белпрэсе, у Дубровенскім і Касцюковіцкім раёнах. Зараз тэатр зноў выехаў на гастролі, каб абслужыць Мсціслаў, Клімавічы, Сянно і Горкі.

У часе гэтых гастроляў тэатр будзе працаваць над новай п'есай маладых беларускіх драматургаў Рудзько і Стэльмаха. Тэма п'есы — разгром варожых шпіёнскіх гнёзд. Гэтую п'есу тэатр мяркуе выпусціць да XXI гадавіны Кастрычніка.

У будучым 1939 годзе тэатр ажыццявіць дзве пастаноўкі класічных п'ес — «Варвары» М. Горкага і адну з п'ес К. Гальдоні.

З беларускіх арыгінальных п'ес тэатр уключае ў рэпертуар новую камедыю К. Крапівы. З перакладных у рэпертуар уключана «Таня» Арбузава.

Што больш за ўсё хвалюе наш тэатр напярэдадні новага сезона? Перш за ўсё тэатру патрэбна памяшканне.

Тэатр увесь час сам арандуе памяшканне, выдаткуючы на гэта вялікія грошы з свайго бюджэта. Зараз часова арандуем два пакоі ў клубе «Комінтэрн».

Упраўленне па справах мастацтваў, абласное ўпраўленне, мясцовыя барысаўскія арганізацыі добра ведаюць аб гэтым і чамусьці лічаць такое становішча нармальным. З-за гэтага тэатр не можа разгарнуць патрэбнай работы па творчаму выхаванню актораў што прыйшлі ў тэатр з гурткоў мастацкай самадзейнасці.

Нашы калгасныя тэатры ўсё яшчэ знаходзяцца ў стадыі свайго станаўлення. І тэрмін гэтага станаўлення чамусьці бясконцы.

Шкоднікі, ворагі народа ўвесь час затрымлівалі рост нашых калгасных тэатраў.

Новае кіраўніцтва Упраўлення па справах мастацтваў не зрабіла яшчэ нічога, каб стварыць неабходныя ўмовы для работы нашых калгасных тэатраў.

Асабовы склад нашых калгасных тэатраў вызначаецца на аснове даўно аджыўшых норм аб калгасных тэатрах. Прычым, нават гэтыя старыя нормы да гэтага часу няшчадна змяншаюцца. Чым вытлумачыць такі анекдатычны факт, што ў каштарысе калгасных тэатраў на 1938 год няма адзнакі электраасвятліцеля сцэны. Нават аднаго асвятліцеля! Нашым калгасным тэатрам не даецца магчымасць мець чарговага рэжысёра, і ўся галоўная работа кладзецца на плечы аднаго мастацкага кіраўніка.

Самае-ж балючае пытанне нашых калгасных тэатраў — іх вельмі абмежаваны акторскі склад. 15—18 актораў для калгаснага тэатра, — як паказала практыка, ніяк не задавальвае, пазбаўляе магчымасці даць высокаякасныя спектаклі. Зусім адпадае праблема дубляжа, які неабходны калгаснаму тэатру, нават больш, чым стацыянарнаму.

Неабходна даць магчымасць калгасным тэатрам мець дастатковы акторскі склад. Пастаноўка невялікіх п'ес, аднаактовак не можа вырашыць справы, бо наш калгасны глядач вырас і патрабуе сапраўдных спектакляў, п'ес савецкіх аўтараў і класікі.

Упраўленне па справах мастацтваў пры СНК БССР і абласныя ўпраўленні павінны неадкладна ўмацаваць калгасныя тэатры — забяспечыць ім нармальныя ўмовы для творчай работы, і тады ў наступаючы сезоне калгасныя тэатры здолеюць папоўніць свой рэпертуар спектаклямі, вартымі нашага гледача — працоўных горада і калгаснай вёскі.

П. ДАНІЛАЎ,
мастацкі кіраўнік Барысаўскага калгаснага тэатра.

Стварыць высокамастацкія спектаклі

Калгасныя тэатры жывуць і працуюць без пэўнай творчай дапамогі, не маючы свайго творчага стылю, творчага профілю. Акторы калгасных тэатраў творча растуць вельмі мала, а таму вобразы распрацоўваюць не глыбока, а часам і няправільна. Гэта ўсё таму, што работа ў калгасных тэатрах яшчэ пастаўлена несур'ёзна, адсутнічае сталая дапамога з боку дзяржаўных тэатраў БССР.

Увага да калгасных тэатраў рэспублікі з боку Упраўлення па справах мастацтваў недапушчальна малая. Можна арганізаваць сувязь калгасных тэатраў з рэспубліканскімі, прысылку для творчых гутарак вядучых рэжысёраў. Гэтага няма. Думаем, што новае кіраўніцтва Упраўлення па справах мастацтваў усяляк будзе дапамагаць калгасным тэатрам, якія жадаюць і могуць працаваць.

Рэпертуар калгасных тэатраў у большасці выпадковы. Часам любая п'еса, якая трапіла пад руку, нават антымастацкая, ставіцца на сцэне калгасных тэатраў. Вельмі цяжка знаходзіць п'есы для калгасных тэатраў, бо ў тэатры ўсяго 18 чалавек актораў—лічба, устаноўленая Упраўленнем для калгасных тэатраў. Неабходна ўкамплектаваць акторскі склад калгасных тэатраў хоць-бы з 25 чалавек. Тады можна будзе ставіць амаль любую п'есу.

Так званыя калгасныя варыянты, што з'явіліся зараз, часам даходзяць да абсурду. Гэтыя калгасныя варыянты часам зусім скажаюць ідэю п'есы, яе мастацкую і палітычную вартасць.

З-за гэтага пастаноўкі ў калгасных тэатрах, а ў прыватнасці ў Полацкім, вельмі нізкія па сваёй мастацкай якасці. Устае пытанне аб неабходнасці кансультацыі з боку кваліфікаваных крытыкаў, рэжысёраў і актораў нашых дзяржаўных тэатраў.

Калгасныя тэатры БССР існуюць ужо па два-тры гады. Як яны працуюць, якія творчыя перспектывы гэтых тэатраў, творчыя ўдачы і няўдачы — пра гэта ніхто не ведае. А ведаць трэба. Пастаўлена пытанне аб фестывалі калгасных тэатраў у г. Менску. Прагляд спектакляў калгасных тэатраў у г. Менску, безумоўна, павінен прайсці пры актыўным удзеле шырокай грамадскасці сталіцы.

Газета «Літаратура і мастацтва» павінна ўдзяляць месца на сваіх старонках выказванням творчых работнікаў калгасных тэатраў, друкаваць артыкулы вядучых рэжысёраў і актораў аб тэхналогіі стварэння мастацкага вобраза, аб рабоце над спектаклем, выказванні мастакоў аб афармленні спектакляў на малой сцэне і т. д.

У артыкуле тав. Андрэева зусім верна сказана аб тым, што калгасныя тэатры не працуюць над п'есамі А. М. Горкага. Гэта велізарны прабел у рабоце ўсіх калгасных тэатраў. П'есы А. М. Горкага, бясспрэчна, трэба ставіць. На горкаўскіх вобразах расце актор, на горкаўскіх п'есах развіваецца мастацкі густ гледача. У нас многа гавораць аб вылучэнні рэжысёрскага маладняка, але нічога не робяць у гэтым напрамку.

Мы, работнікі калгасных тэатраў, далёка знаходзімся ад цэнтра. Але нам неабходна бачыць добрыя спектаклі. Адсюль выцякае неабходнасць экскурсій калгасных тэатраў на спектаклі вядучых тэатраў БССР, а таксама Масквы і Ленінграда.

Новы тэатральны сезон Полацкі калгасны тэатр сустракае ўпартай працай над радам новых п'ес і дапрацоўкай спектакляў: «Вочная стаўка», «Год 19» і «Беспасажніца». Уключаем у рэпертуарны план 1939 г. адну з п'ес А. М. Горкага.

Хочацца сказаць аб форме спектакляў калгасных тэатраў. Не варта гнацца за вялікімі палотнамі і ставіць іх, як ставяць у вялікіх тэатрах. Трэба ставіць добрыя, невялікія п'есы ў яркай, жывой, займальнай форме. Спектаклі калгасных тэатраў павінны афармляць лепшыя мастакі БССР.

Васілій МІЦІН,
актор Полацкага калгаснага тэатра.

«ЛЮБОЎ ЯРАВАЯ» Ў ВІЦЕБСКІМ ТЭАТРЫ.
Сцэна з IV акта: засл. арт. рэсп. А. Ільінскі — матрос Швандзя, артысты: П. Івянова — чырвонармеец Пікалаў, П. Сяргейчык — прафесар Гарнастаеў.
Фота Каплінскага.

В. НЕБЫЛІЦА



Ля Днястра

(АПАВЯДАННЕ)

Наддністроўскія берагі не такія ўжо і высокія. Часам яны ўздымаюцца на працягу некалькіх кілометраў. У дзеякіх месцах ад прымежнага мястэчка Хоцін у гару яны абрываюцца адразу. Ля падэшваў абвалу безупынна бурліць і віхрыцца чыстая дністроўская вада. Яна размывае тысячы дробных і вялікіх каменняў, што за сотні год сабраліся на дне рэчкі.

Далёка за сялом чуваць шум вады ў нізе Жахлівага абвалу. Жахлівым яго назвалі ў дваццатым годзе. Аднойчы цёмнай ноччу там над рэчкай белапольская банда закатавала і кінула ў вадаварот на каменні, што тырчэлі паверх вады, Гуляй Пятра — кіраўніка сялянскай беднаты.

У той-жа дзень пад вечар выправіла маці сына Фёдара на другі бераг рэчкі. А праз пяць дзён яна давядалася, што Фёдар загінуў у няроўнай барацьбе з ворагам.

Удоўж вуліцы праскакала каля дзесятка белапольскіх уланаў, а потым зноў стала ціха. Здавалася, што справа ідзе як найлепш. Людзі выходзілі на вуліцы, перакідваліся цераз вуліцу парою слоў, зноў хаваліся да сваіх дзетак з вялікай надзеяй у сэрцы.

На двары зусім сцямнела. Патухлі каганцы ў сялянскіх хатах. Упершыню за апошнія 4—5 месяцаў спакойна спала сяло. І раптам хату Гуляй Адаркі абкружылі уланы.

— Дзе твой Фёдар?—з дзвярэй грымнуў адзін з белапалякаў.

— Загінуў, вось... — яна рванулася да стала за пісьмом ад таварышоў Фёдара.

— Брэшаш, ведзьма, ён... ты яго схавала!—і шомпал лёг уздоўж спіны Адаркі. Хтосьці з драпежнікаў засмяяўся і гэты смех глыбока пакрыўдзіў Адарку.

— Каты,—выпрастаўшыся праказала яна.—Вы закатавалі мужа, вы закатавалі сына, катуйце і... Зноў над галавою свіснуў шомпал. Адарка ўпала на падлогу ў непрытомнасці.

— Вады ёй, хай глядзіць...

Над маткаю схілілася адзіная дачка Ніна.

— Бярыце яе,—прасіпеў кат.

Ніну схапілі, сарвалі з галавы белую хустку і завязалі рот, нос і вочы. Потым маці таксама звязалі рукі і паставілі ля грубы. На стале міргаў каганец. Ніна пручылася, але ні аднаго слова сказаць не магла. А маці нібы ўкопаная стаяла ля грубы і глядзела...

Раніцой суседзі прынеслі на руках Ніну ў хату, халодную і мёртвую.

У гэты час дзесьці за сялом грымнуў стрэл з гарматы. За ім другі, трэці, а потым—сотні стрэлаў. Гэтыя стрэлы заглушылі ўсё і калі на хвілінку сціхалі, у вёсцы рабілася зусім ціха.

Адарка залезла на печ і ўвесь час стагнала. Ля парога сядзеў пятнаццацігадовы Пятро і рыхтаваў вінтоўку. Час-ад-часу ён узнімаўся на ногі і пазіраў на вуліцу. Ля хлява хтосьці свіснуў. Пятро ўсхапіўся і, перакінуўшы вінтоўку праз плячо, выпаў.

— Куды?—з печы крыкнула маці. Устрывожаны голас маці спыніў Пятра, але толькі на адзін міг.

— Не турбуйцеся, мама, мы пераможам,—пачула яна яго ласкавы голас.

А за вёскай кіламетраў за шэсць уздоўж рэчкі не пакідалі грукатаць гарматы. Стагнала зямля, уздрыгаліся абадраныя сялянскія хаткі. Уначы ўсё сціхла. А раніцой зноў забумкалі гарматы, але ўсё далей і далей.

— Палякі адступаюць,—хутка аблецела вёску вестка.

Праз некаторы час у вёску зайшлі чырвоныя. Адарка доўга хадзіла сярод іх, адшукваючы свайго сына Пятра, але не знайшла. Чырвоныя ішлі на Ільвоў. Санітаркаю пайшла з імі і Адарка. Яна лазіла пад кулямі, падбірала раненых, выратоўвала іх ад смерці і ўвесь час думала пра Пятра.

— А можа яго ўжо і няма?..

***

Пятро выскачыў за вароты і разам з таварышам Лёўкаю кінуўся праз гароды да чырвоных. Разрываліся снарады і з бур'янам, галлём і карэннямі ўздымалі слуп зямлі. Навакол не відно ні адзінай жывой істоты. Раптам з-за дрэва выскачыў чалавек.

— Вы хто, чаго тут бадзяецеся? — запытаўся ён, пазіраючы на Пятра.

— Я—Пятро Гуляй.

— А бацька ў цябе ёсць?

— Ён загінуў героем.

«Ягонага бацьку таксама Пятром звалі», падумаў камандзір чырвоных Налівайка.—Ну добра, будзь з намі,—сказаў ён. — А гэта хто?

— Мой таварыш. Лёўкай завецца.

Вечарэла і адначасова сціхала страляніна. Налівайка сядзеў на арубаным дрэве. Яго абкружылі камандзіры.

— Да дванаццаці гадзін заўтрашняга дня мы павінны выбіць палякаў — такі загад камандавання арміі,—гаварыў Налівайка.

— Мы павінны звязацца з партызанамі,—унёс прапанову адзін з камандзіраў.

— Гэта правільна,—згадзіўся Налівайка,—але каго-ж паслаць? Мы загубілі больш дзесятка лепшых байцоў, а ўсё-такі не звязаліся — не прапускаюць.

— Я пайду,—скочыў адзін з камандзіраў.

— Не, ты не пойдзеш,—запратэставаў Налівайка,—пазавіце мне нашых наймаладзейшых байцоў.

— ... Заданне вельмі важнае, — заканчваў свой загад Налівайка,—яно вырашае лёс нашага атрада. Я спадзяюся, што вы выканаеце яго з гонарам.

— Вядома, выканаем, — адказалі хлапчукі.

Шэрань клалася на зямлю. Хлапчукі ляжалі ў траве над рэчкаю. Ад Жахлівага абвалу даносіўся шум вады, але тут рэчка цякла ціха, непрыкметна.

— Лёўка,—сказаў Пятро,—ці можаш ты нырнуць у ваду і па дну прайсці ўсю рэчку?

— Магу.

— Хлусіш.

— Ну, ну. У тым годзе...

— А ну, нырні,—перабіў яго Пятро.

— А ты бачыш,—паказаў Лёўка на той бок рэчкі.

— Ды бачу,—скрывіўся Пятро.

На другім беразе Днястра ўзад і ўперад хадзіў вартавы. Метраў на пяцьсот ад яго — другі, а там — трэці—і так па ўсяму берагу.

— Пойдзем да моста,—параіў Пятро.

— Там таксама не пройдзеш.

— Пойдзем,—настойваў Пятро.

Па дарозе да моста Пятро заўважыў тоўсты сасновы сук.

— Вазьмі, Лёўка.

— Навошта?

— Бяры. — Потым Пятро штосьці доўга шаптаў яму, размахваючы рукамі.

Пятро пабег па масту, а за ім з кіем гнаўся Лёўка.

— Дзядзечка,—крычаў Пятро вартавому,—ратуйце.

Патруль падбег да яго. Лёўка, пагражаючы кіем, адставаў.

— Дзядзечка ён хоча мяне забіць а хіба я вінаваты,—скардзіўся Пятро.

Патруль насцеражыўся:—За што?

— Галубоў у яго хтосьці пакраў, дык хіба-ж я вінаваты. Адпусціце мяне да цёткі, яна вось там,—і паказаў рукой на вёску.

Вузенькаю, гарбатай вуліцаю бег Пятро на гару. Яго цягнула да сваёй маткі, але няма калі. Ён спыняецца да абадранай, перакошанай на бок хацінкі. Там жыве Сцяпан Галабародзька. Пятро стукае ў дзверы. Да яго выходзіць сцяпанава жонка. Ён перадае ёй пакет.

— Я буду там,—шэпча ён і хаваецца ў хляве.

Доўга цягнуцца хвіліны. Сцяпанава жонка выйшла з хаты і, азіраючыся навокал, пайшла на гарод. На гародзе зашалясцела трава. Да хлява ішоў Грыцко Жыжа. За ім сходзіліся і іншыя. Апошнім прыйшоў Сцяпан Галабародзька і яго брат Грыцко. Яны прывалаклі кулямёт.

— Налівайка выступае па нашаму сігналу, — сказаў Сцяпан, выціраючы з твару пот.

— Дык давай, чаго чакаць,—настойваў Грыцко Жыжа. Яго падхапілі іншыя.

Над вёскай луснула два стрэлы. У адказ бумкнула гармата.

Брыгада Налівайкі падыходзіла да пераправы. Дзве спробы ўзяць яе былі адбіты белапалякамі. І раптам з іх тылу данеслася гучнае «Ура!» Адначасова застракатаў кулямёт. Ад нечаканасці белапалякі разгубіліся і пачалі ўцякаць. Брыгада Налівайкі пераправілася цераз рэчку.

Дзён праз пяць брыгада Налівайкі, рэарганізаваная ў дывізію, вярталася на Украіну для барацьбы з бандамі. Наперадзе ехаў Налівайка, за ім яго першы памочнік Сцяпан Галабародзька. Пятро і Лёўка. Знаёмыя людзі радасна сустракалі слаўных байцоў, народных герояў. Пятро прабег вачыма па натоўпу. Няхай яна, яго родная маці, паглядзіць на яго! Ды яе не было. Дывізія спынілася на адпачынак. Пятро, даручыўшы каня Лёўку, пабег да сваёй роднай хаты. Вось яна! Тут ён узрос, адсюль выправілі бацьку і брата Фёдара, адсюль вынеслі труну з целам Ніны.

— А дзе-ж маці? У хатцы павыбіваты амаль усе шыбы. На падлозе валяюцца пабітыя гаршкі і міскі. Ад усяго вее пусткай.

— Дзе-ж маці?—са слязьмі на вачах пытаўся сам у сябе Пятро.

Адказу не было: ціша і пустэча.

Пастаяўшы з хвіліну сярод хаты, Пятро пайшоў да Налівайкі.

***

У мястэчку над Днястром сабраліся вайсковыя часці. Яны толькі што скончылі асеннія манеўры. На плошчы сходзіліся людзі. У белым халаце прыйшла і стала з боку бабулька гадоў пяцідзесяці пяці. Яе ведалі амаль усе жыхары мястэчка. Часцей за ўсё бачылі яе ў белым халаце і толькі ў выходны дзень надзявала яна святочную вопратку, выходзіла да Днястра і доўга-доўга глядзела на той бок рэчкі. А пасля на працягу пяцідзёнкі, і на базары, і ў аптэцы, і ўсюды бачылі яе ў белым халаце. А калі людзі запытваліся, чаму яна носіць гэты халат,—бабулька адказвала:

— На ўсякі выпадак, каб заўжды быць гатовай дапамагчы хвораму.

І ёй верылі. За семнаццаць год жыхарства ў мястэчку яна выратавала жыццё не аднаму чалавеку. Яе шанавалі за працавітасць, уважлівасць, за дбайныя адносіны да кожнага хворага чалавека.

На трыбуну, што стаяла сярод плошча, узышоў старшыня райвыканкома, за ім сакратар райкома, а потым камандзір вайсковага з'яднання. На яго грудзях зззяў ордэн Чырвонага Сцяга. Бабулька, што ўвесь час стаяла на адным месцы і сачыла за танцамі моладзі, захвалявалася. Яна пільна ўзіралася ў твар камандзіра. Камандзір гаварыў пра моц Чырвонай Арміі, пра яе гатоўнасць у любую мінуту стаць на ахову савецкіх граніц, але бабулька нічога не чула,—думкі яе былі далёка ў мінулым. Можа яна выратавала яму жыццё?.. Можа... Гром апладысментаў перарваў успаміны.

— Прывітанне байцам і камандзірам з'яднання, якім камандуе камдыў таварыш Гуляй! Ад трыбуны данесліся словы прамоўцы і злоў гром апладысментаў патрос паветра.

— Пятро, сынок мой родны,—вырвалася з грудзей бабулькі. Усе глядзелі на яе. А яна не адчуваючы пад сабой зямлі, забыўшы сваю старасць, кінулася да трыбуны.

А пад вечар камандзір дывізіі са сваёй маткай сядзелі ў парку, што цягнецца па-над Днястром, і глядзелі на Жахлівы абвал.

— Вы шчаслівая, мама, — гаварыў Пятро, заглядаючы ў вочы маці.

— Так, я шчаслівейшая за тых, што асталіся на тым беразе. Але і над імі ўзнімецца зара шчасця, волі і праўды.

Як і семнаццаць год назад, ля падэшвы абвалу бурліць і віхрыцца чыстая дністроўская вада. Ды не тыя песні спяваюць на тым беразе дзяўчаты і хлопцы заняволенага польскімі панамі сяла. Яны выходзяць на бераг, праз рэчку ловяць словы і матыў савецкіх песень і таямніча, схаваўшыся дзесьці ў глухім месцы, доўга спяваюць іх.

(Пераклад з украінскай мовы).

Да юбілею Т. Г. Шэўчэнка

„КАБЗАР“ НА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

Брыгада беларускіх паэтаў у складзе тт. Янкі Купалы, Якуба Коласа, Зм. Бядулі, К. Крапівы, П. Броўкі, П. Глебкі, А. Куляшова, М. Клімковіча пераклала на беларускую мову зборнік выдатных твораў Т. Г. Шэўчэнкі—«Кабзар».

У лік твораў перакладзеных на беларускую мову Янкай Купала, уваходзяць паэмы «Тапаля», «Тарасава ноч», «Кацярына», «Заварожаныя», «Каўказ», «Гайдамакі», камедыя «Сон» і інш.

Якуб Колас пераклаў шаснаццаць твораў Шэўчэнкі, з якіх найбольш буйныя — «Мар'яна Чарніца», «Утопленка», «Гамалія», «Сава», «Ерэтык», «Нявольнік» і інш.

П. Броўка пераклаў паэмы «Маскалева крыніца», «Пятрусь», «Юродзівы» і інш.

Змітрок Бядуля пераклаў паэму «Асіна» і рад дробных вершаў.

Таксама рад твораў Шэўчэнкі пераклалі П. Глебка, А. Куляшоў, М. Клімковіч.

Апрача «Кабзара», да юбілею Шэўчэнкі выйдуць з друку на беларускай мове рыхтуемыя сектарамі мастацкай і дзіцячай літаратуры Белдзяржвыдавецтва паасобныя творы Шэўчэнкі.

---- O ----

У сёнешнім нумары мы друкуем творы вялікага украінскага кабзара Тараса Грыгор'евіча Шэўчэнкі ў перакладзе ЗМІТРАКА БЯДУЛІ на беларусскую мову.

Т. Г. ШЭЎЧЭНКА

У КАЗЕМАЦЕ

Маім саюзнікам прысвячаю

Н. КАСТАМАРАВУ

Вясёла сонейка ырала
У вясёлых хмарах веснавых,
Гасцей закованых сваіх
Сардэчным чаем частавалі
І вартавых перамянялі,
Сінемундзірых вартавых.
І да давярэй, на ключ замкнутых,
Да моцных кратаў на акне
Прывык я трохі... і ўжо мне
Не было шкода слёз атрутных,
Даўно забытых і пакутных,
Маіх крывавых цяжкіх слёз.
Ці мала пала гэткіх рос
На сухаполле... Хоць бы рута,
А то нічога не ўзышло!
Успомніў я сваё сяло...
Каго я там калі пакінуў?
Бацькі ляжаць у дамавіне...
І жалем сэрца апякло,
Што ўспамінаць каго не маю!
Гляджу я: вунь твая старая,
Чарней за чорную зямлю,
Бы з крыжа знятая, ступае.
Малюся! Госпада хвалю!
Хвалю я ў кожную мінуту!
Што я ні з кім не падзялю
Маю турму і мае путы!

У каземаце.
(1847).

*

Ой тры шляхі шырокія
Ды разам зышліся;
На чужыну з Украіны
Браты разышліся.
Пакінулі сваю маці,
Той жонку пакінуў,
А той—сястру, а наймяншы —
Мілую дзяўчыну.
Пасадзіла тады маці
Тры ясені ў полі,
А нявестка пасадзіла
Стромкую таполю.
Тры явары пасадзіла
Сястра пры даліне...
А дзяўчына маладая—
Свежую каліну.
Не прыжылі тры ясені,
Таполя ўсыхала;
Паўсыхалі тры явары,
Каліна завяла.
Тры браты ўсё не прыходзяць,
Плача, стогне маці,
Плача жонка з дзетачкамі
У сцюдзёнай хаце.
Сястра плача — йдзе шукаці
Братоў на чужыну...
Для заручанай дзяўчыны
Робяць дамавіну.
Тры браты ўсё не прыходзяць,
Па свету блукаюць,
А тры шляхі шырокія
Цернам зарастаюць.
У каземаце.
(1847).

**

Сустрэча будзе ў вас нанова
Ці разышліся наўсяды?
І слова брацтва і любові
Панеслі ў стэп і лес густы?
Хай так... Хоць маці і чужая,
А давядзецца — паважаем.
То воля неба. Трэба жыць,
Змірыцца і маліцца богу,
І памятаць адзін другога,
Сваю Украіну любіць,
Любіць яе... У час пакуты,
У апошнюю сваю мінуту
За Украйну госпада маліць.

У каземаце.
(1847).

**

Тужу ў няволі... Хоць і волі
Сказаць па праўдзе, не было.
Ды ўсё-такі жыццё плыло,
Хоць на чужым, народным полі...
Цяпер-жа злой ранейшай долі,
Чакаць, як бога, прыпякло.

Яе цярпліва я чакаю,
Дурны свой розум праклінаю,
Што даўся дурням адурыць,
У лузе волю утапіць.

Аж стыне кроў, як прыгадаю,
Што не ў Украйне пахаваюць,
Што не ў Украйне буду жыць,
Людзей і госпада любіць.

У каземаце.
(1847).

Да 125-годдзя з дня нараджэння Т. Г. Шэўчэнка. Праект помніка Т. Г. Шэўчэнка, які будзе пастаўлен у Кіеве. Аўтар праекта—засл. дзеяч мастацтваў М. Г. Манізер.

(Саюзфота).

**

Рана ўранку новабранцы
Павыходзілі з сяла,
А за імі маладымі
І дзяўчына ціха йшла.
Рупна маці падыбала,
Дочку ў полі даганяла...
І дагнала, прывяла;
Наракала, гаварыла,
Пакуль ў яму палажыла,
Жабраваць сама пайшла.
Годы йшлі, сяло нікольки
Выгляд не змяніла.
Толькі пустка на адшыбе
Сцены пахіліла.
Каля пусткі на мыліцы
Маскалёк кульгае,
На салочак кіне вокам,
Пустку аглядае...
Марна, браце! Чорных бровак
Не відаць у хаце,
Не пакліча на вячэру
У хату яе маці...
А даўным-даўно... Калісьці!
Ручнікі ўжо ткалі,
Ды мярэжылі хусціну,
Шоўкам вышывалі.
Думаў жыць і мілавацца,
Ды дзякаваць богу!
А прышлося... Прыхіліцца
Няма ні да кога.
Сядзіць сабе каля пусткі,
Надыходзяць змрокі,
А ў ваконца старой бабай
Сава лыпіць вокам.

У каземаце.
(1847).

**

«Не кідай матку!—гаварылі,
А ты пакінула—ўпякла,
Шукала маці—не знайшла,
Ды ўжо і пошукі спыніла...
Памерла плачучы. Даўно
Пануе ціш, дзе ты гуляла;
Сабака ў свет павандравала,
І ў хаце выбіта акно.
У цемравым садку ягняты
Удзень пасуцца, а ўначы
Вяшчуюць совы і сычы,
Не даюць спаць па блізкіх хатах.
І твой барвенак крыжаваты
Трава прыглушыла й карчы.
Цябе чакае ён. І ў гаі
Ставочак чысты высыхае,
Дзе ты купалася зарой.
І гай сумуе за гарой.
У гаі птушка не спявае—
Яе з сабой ты панясла.
Вятры крыніцу завалілі,
У яру вярбіну прыхілілі.
І сцежачка, дзе ты хадзіла,
Калючым цернам парасла.
Ты дзе красу сваю падзела?
Ты да каго пераляцела?
Скажы — ў чужой зямлі, сям'і
Каго ты радуеш?—Скажы...
Да кога рукі прыраслі?
Вяшчуе сэрца, што багата
Ты раскашуеш, не шкада
Табе пакінутае хаты...
Благаю бога, каб бяда
Цябе да веку не арушыла,
Каб у палацы не знайшла...
Каб бога ты не асудзіла,
І маці ты не пракляла.

У каземаце.
(1847)

Якуб КОЛАС

У СУХМЕНЬ

Злегла воўнаю густою
Цемра ночы над зямлёю.
Ціпшыня. Цяплынь.
Скрозь прагалы хмар кашлатых
Зорань зоры, як дзяўчаты,
З цьмяных далячынь.

Лес стаіўся нерухома,
Нібы ловіць голас грома
З тых далёкіх хмар.
Дзесьці паляць бліскавіцы,
Цемру гушкаюць зарніцы,
Родзяць слодыч мар.

І зямля заціхла нема,
У турботе не дрэма —
Эх, каб дожджык ёй!
Нібы ў тон яе турботам
Пад застрэшкам каля плоту
Пчол гамоніць рой

Ды так ціха, ды так глуха!
У тым гудзе чуваць скруха,
Ці то жаль зямлі.
Дзесьць цвіркун бесперастанку
Цягне сумную спяванку
У густым галлі.
Ды ўстрывожана пташына
Па-над рэчкай у нізіне
Свіоне, бы ў кларнэт.
Праплыве гук баяліва
Па-над лугам, па-над нівай
У знямелы свет.

Ды зноў ціха-ціха стане.
Ноч у чорным сарафане
Робіць свой абход,
Расчыніўшы акяніцы
Ясным зорам і зарніцам,
Люстру ціхіх вод...

Хмары ходзяць і знікаюць,
А зарніцы палыхаюць —
Аж трасецца цьма!
І глядзіць зямля гаротна
На бясплодныя палотна—
Не: дажджу няма!

15-IX—38 г.

---- O ----

„МАЯ МАРА ЗБЫЛАСЯ“

Малады беларускі паэт Міхась Калачынскі прызван на сапраўдную вайсковую службу ў рады Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі.

Да прызыва ён рыхтаваўся старанна. Калі прызыўная камісія прызнала тав Калачынскага годным для вайсковай службы ў яго любімай і жаданай авіяцыйнай часці, ён горда заявіў:

— Мая мара збылася. Я ўсе свае сілы аддам для ганаровай службы ў роднай Чырвонай Арміі. Надзеі свайго народа, які пасылае мяне ў армію гордых сокалаў совецкай краіны, я апраўдаю з поспехам.

Ніжэй мы друкуем верш тав. Калачынскага «Ганарыцца маці», прысвечаны адыходу ў РСЧА.

Міхась Калачынскі

ГАНАРЫЦЦА МАЦІ...

Над зямлёю цішыня узнята,
Вецер ліст на дрэвах не кране.
Сабірайцеся, сябры, на свята,
Выпраўляйце ў армію мяне!

Па-гасціннаму у нашай хаце,
Пірагі спяклі мне на паду.
Ганарыцца на ўсю вёску маці,
Што ў паветраны я флот іду.

О, сябры, мяне вы добра зналі,
Мы дружылі шчыра з малых год.
Вы яшчэ ў маленстве мне жадалі,
Каб вадзіў я ў небе самалёт.

Так жадала і мая падружка..
Помніш, летам, жніўнаю парой,
Калі звонкія ляцелі птушкі,
Ты услед махала ім рукой.

Праляцайце, птушкі, без самоты,
Вейце ім, папутныя вятры!
Апраўдаю званне я пілота
І надзеі вашыя, сябры!

Юр. Рудзько і Вл. Стэльмах

„КРАВЕЦКІЯ“

Ніжэй змяшчаем урывак з п'есы Юр. Рудзько і Вл. Стэльмаха «Кравецкія», якая ўключана ў рэпертуар Барысаўскага калгаснага тэатра. Тэма п'есы — пільнасць нашага совецкага народа, разгром варожых гнёзд фашысцкіх найміттаў, якія арудвалі ў сельскай гаспадарцы БССР.

Патрыёты нашай радзімы старшыня калгаса Антон Кравецкі і яго дочкі—малады навуковы работнік Людміла і лейтэнант Валенціна здолелі выкрыць шпіёна-дыверсанта, які хаваўся пад маскай навуковага работніка, Віктара Боднева. Вось кароткі змест п'есы.

Калгасны дзядзінец. Злева — стайня. На бярвеннях сядзіць Кумок. Каля яго — хлопчык Дзімка. Надвячорак.

Дзімка (працягвае расказ). І здалося мне, што «Арліца» наша двух жарабкоў нарадзіла. І такія яны ладныя ды прыгожыя, растуць на ўцеху нам. А як выраслі, парашылі мы арміі нашай перадаць іх. Самому Кліменту Ефрэмавічу ва ўласныя рукі перадаць. Каму-ж везьці? Падумалі ва ўпраўленні, памеркавалі, ды і згадзіліся на тым, што Змітру Адамавічу — вам, дзядзька, ды Дзімку — мне, значыцца. Яны іх гадавалі, хай і вязуць, — так сказаў Антон Кузьміч. Прыязджаем у Маскву. Шмат людзей там, і ўсе яны нас сустракаюць. Спяшайце хутчэй, кажуць, на Красную плошчу. Вас Клімент Ефрэмавіч чакае... Прыводзім коней туды. І сваімі вачыма бачым Клімента Ефрэмавіча — усміхаецца, такі ласкавы ды прыветны. Рукі нам паціснуў. Зірнуў на нашых вараных — спадабаліся. Хто гадаваў? — пытаецца. Так і так, кажу. Зміцер Адамавіч ды я—Трэба ўзнагарадзіць вас за выдатную працу, — кажа ён.

Кумок. Так і сказаў?

Дзімка. Так. А я маўчу ды думку адну таю. Усміхнуўся Клімент Ефрэмавіч, ды і кажа: — Ты нешта папрасіць хочаш, ды саромеешся пэўна. Гавары. Змагу—зраблю.—Таварыш нарком абароны, — кажу яму. — У армію хачу, ды вось гадоў яшчэ нехапае. Зноў усміхнуўся ён, зірнуў на мяне. Добра, кажа. Прымем. Падабаешся ты мне. Сядай на каня ды паедзем з табою. Зірнем, што на граніцы. Ці спакойна там усё. Паехалі. І от лес перад намі. Якраз, як наш, што ля Белай Крыніцы. Бачым — ворагі адтуль, як груганнё чорнае, вылятаюць. Тут як выхапіць Клімент Ефрэмавіч шаблю, аж вецер загуў. За мной!! — крыкнуў, ды пачаў рубіць — касіць направа, налева, канём таптаць... Я таксама як замахнуўся на аднаго... І прачнуўся. І гэтак горка мне стала, што «Арліца» наша хварэе. Можа толькі прафесар гэты на ногі яе паставіць.

Кумок. Ды ён і не прафесар яшчэ, з дацэнт толькі.

Дзімка. Дацэнт? Гэта як?

Кумок. А розніца між прафесарам і дацэнтам прыкладна такая, як між мною і табою. Я — пастух, ты — падпасак.

Дзімка. Не так гаворыце, дзядзька Зміцер. Зараз наадварот будзе.

Кумок. Гэта, дружа, чаму?

Дзімка. А старшыня сказаў, што мяне прызначае пастухом, а вас...

Кумок. Добра, добра, не труці душу. Што я казаў табе? За махоркай трэба. А ты?

Дзімка. Зноў за махоркай? Калі паспяваеце яе высмаліць?

Кумок. Пагавары... За махоркай злётай, дружа, ды хутчэй.

Дзімка. Пайду, пайду... Чаго злавацца? (Пайшоў).

Кумок. Як гора ў хату, дык следам і бяда... І пошасць гэтая, і са мной здарэнне...

(Уваходзіць Віктар).

Віктар. Добры дзень, Зміцер Адамавіч. Што такі сумны, ці не здарылася яшчэ чаго?

Кумок. Здарылася, на маю галаву. Людзі даведаюцца — ім у вочы не зірні, такое здарылася на старасці.

Віктар. Страшнае што?

Кумок. Гора-бяда. Падпаскам прызначае мяне Антон Кузьміч. Мяне падпаскам, а Дзімку — пляменніка — ставіць начальнікам нада мной, пастухом. Заўтра выганяць стада будзем — ён пасярод вуліцы пойдзе, а я — па дварах. І даведаюцца людзі, што не я ўжо начальнік над ім, а ён — нада мной. Вось, дружа, якія справы-паперы здарыліся на старасці.

Віктар. За што-ж гэта вас?

Кумок. Кажу, дружа, здарэнне. Цялілася ў Лявона карова — лысая, што ў калгасе летась атрымаў прэміяй. Прыгнаў учора Лявон карову на поле да мяне. Прыгнаў і гаворыць: каб цялё расло-гадавалася добра, ды ахвотней было табе, Кумок, даглядаць яго — асушым чацвярцінку. І выняў з кішэні. Я туды, я сюды — не прымае адгаворак. Так і распілі. Потым Дзімку папрасілі, каб яшчэ прынёс. А каровы тым часам у жыта і спаласавалі ладны кавалак. Вось яны справы-паперы мае. Крыўдна тое, што слова даў, хай рэчкай цячэ перада мной гарэлка — не нахінуся, не глыну нават. — Антон Кузьміч не верыць. Што мне слова сваё вяртаць, ці як?

Віктар. Складаная справа, таварыш Кумок. Выходзіць, што старыя кадры ідуць у адстаўку?

Кумок. У адстаўку, таварыш дацэнт.

Віктар. Не цэніць старшыня такіх спецыялістаў сваёй справы, як вы? Такіх людзей?..

Кумок. Так, дружа, так. Што перада мной Дзімка — асінка перад дубам.

Віктар. А як калгаснікі, будуць задаволены тым, што жывёлу—гэты залаты фонд калгаса — даручылі хлапчуку неспрактыкаванаму?

Кумок. Дзе там... Хто гэта можа даверыць яму...

Віктар. Выходзіць, што распараджэнне вынесена старшынёй лёгкадумна?

Кумок. Скасаваць трэба яго.

Віктар. Дык вы не маўчыце, скардзьцеся ў раён, вышэй...

Кумок. Чакайце, чакайце... Па-вашаму — Антон Кузьміч нягодны старшыня? Па-вашаму, калі шкода калгасу зроблена — віншаваць мяне, дзякаваць мне?

Віктар. Здаецца, вы самі пачалі...

Кумок. Чакайце, чакайце... Я проста кажу: калі-б я старшынёй быў, дык такога Кумка, што дабра калгаснага не ўпільнаваў — з калгаса выгнаў-бы. А па-вашаму — мне супроць Антона ісці?

Віктар. Прабачайце, вы мяне не зразумелі.

Кумок. Чаму-ж. Я добра слухаў... Скардзіцца на яго? Так раіце?

Віктар. Дзіўлюся... Што вы за чалавек? Самі распачалі і...

Кумок. Сказаць шчыра, дык і я, дружа, гэтага не разумею. І куды вы цягнеце і што вы за чалавек?

Віктар. Таварыш Кумок, мне патрэбна агледзець коней.

Кумок (устае). Няма майго дазволу на гэта.

Віктар. Чаму?

Кумок. Антон Кузьміч загадаў без яго нікога не дапускаць.

Віктар. Але-ж я...

Кумок. Хоць прафесарам будзьце — не пушчу. Не было мне такога загаду.

Віктар. Дзівак. Для справы, для калгаса горш будзе.

Кумок. Пачакайце. Прыдзе старшыня хутка.

Віктар. Буду чакаць. Але за гэта — адкажаце.

Кумок. Чаму-ж не, адкажу. Лепш сам я зірну, як жарабкі дышуць. (Пайшоў на стайню).

(Уваходзяць Людміла і Валенціна).

Людміла. А ты ўсё тут, Віктар?

Віктар. Хацеў нашых хворых агледзець, але дзівак гэты ваш Кумок не дазваляе ўвайсці. Не разумею...

Людміла. Не хвалюйцеся, Віктар. Зараз выясню. Знаёмся, сястра мая, Валенціна.

Віктар. Дацэнт Бодneў. (Паціскае руку).

(Людміла пайшла на стайню).

Вельмі рад быць знаёмым. Шмат чуў пра вас, Валенціна Антонаўна, і завочна захапляўся.

Валенціна. Не ведаю, чым магла выклікаць гэта захапленне.

Віктар. Мы захапляемся вамі, як чалавекам, які прысвяціў сваё жыццё Чырвонай Арміі. Дарэчы, вы здаецца скончылі вайсковае вучылішча?

Валенціна. У мінулым годзе.

Віктар. І зараз, чуў, працуеце ў штабе?

Валенціна. Служу... У мяне да вас адно пытанне, таварыш Боднеў: як шырока распаўсюдзілася эпізаотыя?

Віктар. Нічога страшнага няма. З'явілася ўспышка захворвання сібірскай язвай. Прычыны высвяляем. Але пагрозы далейшага распаўсюджвання хваробы няма. Мы схапілі ворага за горла і ён не выслізне, мы знішчым яго.

Валенціна. Я таму гэта кажу, што тут намечана правядзенне спартыўнага свята. Я прыехала для падрыхтоўкі яго і прагляду мясцовых калгасных каманд. Але калі эпізаотыя...

Віктар. Ніякай пагрозы, паўтараю. Не турбуйцеся, Валенціна Антонаўна, мая прысутнасць гарантуе.

Валенціна. Веру вашаму аўтарытэту.

Віктар. Між іншым, я вас збіраўся папрасіць: зрабіце для мяне і для навукі адну паслугу.

Валенціна. Калі ў маіх сілах.

Віктар. Мая апошняя навуковая работа мае вялікае значэнне для абароны. Толькі адкрыта гаварыць аб ёй некалькі рана. Патрэбны некаторыя эксперыменты. Ведаеце, навуковы свет крыху скептычна падыходзіць да смелых думак, патрабуе мільёну доказаў. Такім чынам, я хацеў-бы без афіцыяльнага абвяшчэння, папрацаваць з ветэрынарнымі спецыялістамі ў адной з вайсковых часцей. Зрабіць некаторыя назіранні, эксперыменты. А зараз — вельмі зручны момант. Я прабуду досыць значны час у калгасе — з Людмілай. Ваша вайсковая часць — паблізу. Я здолеў-бы весці патрэбную работу і тут і ў вас.

Валенціна. У чым-жа мая дапамога?

Віктар. Пазнаёмце мяне з вашымі спецыялістамі...

(Падыходзіць Людміла).

Людміла. Што ты з такім захапленнем расказваеш, Віктар?

Віктар. Гаворым аб сувязі арміі з навукай.

Валенціна. Аб адкрыцці Віктара Арыстархавіча.

Людміла. Адкрыцці? А мне нічога невядома аб ім. Гэта несумленна, Віктар. Мне — памочніцы, і калі ты лічыш сваім сябрам...

Віктар. Усё — пошукі. Могуць быць і памылкі. Таму і не гаварыў нікому. А вось пасля практычных доследаў можна будзе сказаць афіцыяльна, разам працаваць.

Валенціна. Які канспіратар вы, Віктар Арыстархавіч.

Віктар. Творчыя работнікі наогул не любяць расказваць свае планы раней скончэння сваёй працы.

Людміла. Так. Канспіратар... Канешне, твая справа.

Валенціна. Пакіньце дыскусію, таварышы.

(Уваходзіць Антон).

Антон. Вось яна, сям'я мая. А я шукаю. Спраў столькі, што і не прывітаў цябе, Валенціна, не пагутарыў. Але не гнявіся... Вашу прапанову, Віктар Арыстархавіч, праўленне абмеркавала. Мы рашылі: у нядзелю — праз два дні, значыць, — збяромся і суседа, калгас «Будзёнавец», запросім, ды паслухаем вашу лекцыю.

Валенціна. Проста універсітэт адкрываеце ў нас, Віктар Арыстархавіч.

Віктар. Гэта абавязак кожнага совецкага вучонага.

Антон. Была на стайні, Людміла? Што там?

Людміла. Пакуль без змен.

Віктар. Запэўняю, Антон Кузьміч, што праз дзень—два ўсіх, як кажуць, на ногі пастаўім.

(Уваходзіць Сапун з вудамі ў руках).

Валенціна. Як рыбацкае шчасце, Спірыдон Іванавіч?

Сапун. Плотва—у руцэ, а шчупак—у рацэ. А-а, Віктар Арыстархавіч... Ты, сукін сын, Віктар! Што абяцаў? Што даў?.. На адну чацвярцінку?.. Як справы рабіць, дык мяне, айца...

Віктар. Вы што, звар'яцелі?!

Сапун. Крыўдна і... бывайце здаровы... (Пайшоў).

Антон. Прыдзецца звольніць Сапуна. Не выпраўляецца. Вы не звяртайце ўвагі на яго, Віктар Арыстархавіч. Ён хоць каго абразіць. Хадзем, Валенціна, на гаспадарку зірнем.

(Антон і Валенціна пайшлі).

Людміла. Што за камедыю перад табой разыграў Сапун?

Віктар. Ці мала што можа прыйсці п'янаму ў галаву. Пакінем аб ім гаварыць.

Людміла. Віктар, скажы шчыра, хто мог усё гэта зрабіць тут, чыя рука, па чыёй указцы?

Віктар. Пытанне складанае. Доказаў мала. Але лабарантка напэўне замешана.

Людміла. А Сапун?

Віктар. Наўрад.

Людміла. Мяркуеш, што тут нікога няма?

Віктар. Па моему, няма, усё зроблена праз нашу лабараторыю. І горш за ўсё, што ты—загадчык лабараторыі. У каго-некага можа з'явіцца падазрэнне...

Людміла. Што я?

Віктар. Што пільнасці ў цябе не было.

Людміла. Пільнасці? Так... (Убягае Дзімка).

Дзімка. Людміла Антонаўна, вас Антон Кузьміч гукае, на ферме ён.

Віктар. І мяне?

Дзімка. Не, пра вас нічога не гаварыў.

Людміла. Пасядзі. Пачакай мяне, Віктар. Працягнем гутарку.

(Пайшла з Дзімкам).

Віктар (сеў на бярвенне, упоўголас):
«Яна сказала тут...
Здаецца я не палахлівы зроду
Перад сабой паблізу бачыў смерць».

Сапун. Тут дзесьці круціўся... А вось... Віктар!

Віктар. Стой, Сапун! З табой гаварыць буду... Табе надакучыла відаць на гэтым свеце жыць? Як сабаку!..

Сапун. Віктар Арыстархавіч!.. Віктар...

Віктар. Ні слова! Ты што разыграў сёння? Ты што думаў?

Сапун. Прабачайце, пераб'ю...

Віктар. З табой жартаваць не буду.

Сапун. Сарвалося, даруйце...

Віктар. Паслязаўтра павінны праходзіць вайсковыя часці — зрабі ўсё, што загадаў. А калі...

Сапун. Зраблю. Усё зраблю. Даруйце толькі...

Віктар (адводзіць яго ў бок). Ідзі да Палікарпія і разам... Матэрыялу хопіць. Асцярожней, галоўнае. І ў дзень майго вяселля (усміхаецца).

Сапун. Будзе весела... Хі-хі... (Віктар і Сапун адыходзяць).

(Вяртаюцца Валенціна, Людміла і Антон).

Антон. От што скажу: твае меркаванні правільныя, — тут арудуюць яны, тут.

Людміла. Сапун — пешка ў чыесьці руках.

Валенціна. Патрэбна, значыць, дамку знайсці.

НОВЫЯ П'ЕСЫ ДЛЯ САМАДЗЕЙНАСЦІ

У 7 і 8 нумарах часопіса «Полымя рэволюцыі» надрукаваны тры п'есы — «Гарачае сэрца» М. Паслядовіча, «Кансіліум» і «Не спяшайся доктар, — спаткнешся». — В. Гузарэвіча. Гэтыя невялічкія драматургічныя творы папоўняць рэпертуар мастацкай самадзейнасці, які небагата налічвае арыгінальных твораў беларускіх пісьменнікаў. І тое, што часопіс пачаў друкаваць п'есы, гэта з'яўляецца добрым пачынаннем, якое дапаможа ў некаторай ступені знішчыць той прарыў нястачы рэпертуару, што значна адчуваюць нашы драматычныя гурткі.

Заможна і шчасліва жывуць калгаснікі. Асабліва добра жывецца моладзі. Іх свядомае жыццё пачалося ў сонечнай краіне соцыялізма. Яны працуюць на карысць совецкага народа, у вольны час рыхтуюцца да абароны краіны.

У слаўнай сям'і патрыётаў калгаса «Чырвоны май» — Бабіцкіх былі тры выдатныя сыны — старэйшы Іван — архітэктар, Давід — чырвонаармеец-пагранічнік і малодшы Арсень — стаханавец-трактарыст. Гэтае жыццё і гэтыя прафесіі ім даравала наша цудоўная радзіма. Але і яны не засталіся перад ёю ў даўгу. Малады трактарыст Арсень прыкладна працуе ў калгасе, ён за дзень выканаў тры нормы і гэтым самым перакрыў усебеларускі рэкорд. Уся вёска радуецца, што шляхам стаханаўскіх метадаў працы дабіўся юнак такой вялікай перамогі. А другі брат—Давід, геройска абараняючы граніцы совецкай радзімы ад налёту варожай зграі японскіх самураяў, загінуў смерцю адважнага патрыёта ля возера Хасан. Крыўдна было калгаснікам, што бандыты спынілі жыццё цудоўнага маладога чалавека, сэрцы іх напоўніліся гнеўнай нянавісцю. Яны былі абураны нечалавечым учынкам зарваўшыхся фашыстаў. Стары партызан, старшыня калгаса Мікола Гаўрылавіч і той хоча ўзяць зброю ў рукі і не адступаючы ісці на ворага і разбіць яго на той тэрыторыі, з якой ён прыйшоў да нас. А малады Арсень прымае вінтоўку брата і едзе на Далёкі Усход абараняць совецкія межы. З ім-жа адпраўляецца яго каханая дзяўчына лістаносец Лёня. Калгаснікі калгаса «Чырвоны май» паслалі ліст да наркома абароны першага маршала Совецкага Саюза тав. Варашылава, запэўняючы яго, што яны ўмеюць абараняць заваяванні Сталінскай Канстытуцыі і калі патрэбна будзе, дык дадуць знішчальны ўдар ворагу. Калгаснікі гатовы выканаць ганаровы абавязак грамадзяніна СССР — стаць чырвонымі воінамі Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі.

Гэтым патрыятычным падзеям — нашым выдатным совецкім людзям калгасаў — прысвечана аднаактавая п'еса «Гарачае сэрца» М. Паслядовіча.

Не гледзячы на некаторыя драматургічныя недахопы (нячоткасць фабулы, няяркасць і некаторая натуралістычнасць асобных эпізодаў) аўтару ўсё-ж удалося стварыць у п'есе рад цікавых персанажаў. Цёпла і шчыра напісаны вобраз трактарыста-дапрызыўніка Арсеня Бабіцкага, абаяльна выведзена ў п'есе роля клапатлівай маці Сцепаніды Андрэеўны Бабіцкай, добры лірыка-юмарыстычны вобраз лістаносца дзяўчыны Лёні, своеасаблівы вобраз трактарыста Мішкі.

Вобраз дзеда Віктара зніжае трафарэтная старыкоўская асаблівасць — частыя паўтарэнні слова «якасць». Тым больш крыўдна, што персанаж гэты ва ўсёй п'есе гаворыць сакавітай народнай мовай, а трафарэт толькі збядняе яго.

Дробныя памылкі, якія сустракаюцца ў першым драматургічным творы празаіка Паслядовіча, — у пабудове дыялага, разгортванні, дзеі, у абрысоўцы асобных вобразаў, аўтар, безумоўна, пазбегне, калі ён авалодае драматургічным майстэрствам.

Трэба вітаць пісьменніка Паслядовіча, што ён простай, рэальнай мовай расказаў аб тым патрыятычным уздыме, якім поўны сэрцы совецкага народа, гатовага абараняць у кожную мінуту сваю радзіму ад нападу фашыстаў. Пісьменнік у рэалістычным творы праўдзіва паказаў совецкую рэчаіснасць. Гэтая эпапея абароны совецкай радзімы павінна знайсці большы водгук у творах беларускіх совецкіх пісьменнікаў.

Абодва вадэвілі Б. Гузарэвіча таксама напісаны на матэрыяле сучаснага жыцця.

Трэба заўважыць, што гэтыя вадэвілі не адпавядаюць сваёй форме. Гэта хутчэй камедыі, чым вадэвілі. Нельга не заўважыць дасціпнасці пабудовы сюжэтаў камедый. Пачынаючы драматург добра ведае форму драматургічнага твору і мае здольнасці да творчасці ў галіне гэтага жанру. Дыялагі абодвух камедый напісаны добра, дзея разгортваецца хутка, лёгка, паслядоўна, некаторыя вобразы зроблены ўдала.

Да месца будзе зрабіць рад істотных заўваг, каб дапамагчы аўтару пазбегнуць у далейшым некаторых недахопаў.

У Вадэвілі «Кансіліум» аўтар закранае надзвычай патрэбную праблему — выхаванне маладога пакалення. Жонка архітэктара Глаголева ўжо надта клапоціцца аб сваім сыне Жору. Яна ўбіла сабе ў галаву, што яе сын хворы і не давярае нават ні раённаму ўрачу, ні ўрачу-кансультанту, а патрабуе склікаць кансіліум, каб пераканацца, што дзіця сапраўды здаровае. Гэтая залішняя клапатлівасць толькі балуе хлопчыка і не дае яму правільна развівацца.

Але нашто было склікаць кансіліум? І ставіць у няёмкае становішча старога прафесара, які замест лячэння вымушан аўтарам пісаць рацэпт «на лыжы». Гэта нерэальна і надумана. Некалькі нялобра гучыць і тое, што Жора, сын архітэктара, раптам ужывае ў сваёй гаворцы «блатныя» выразы, кажучы, што гэта ён пераняў ад бацькі. Складаецца ўражанне, што яго бацька некультурны чалавек. Па-першае, гэта не адпавядае сапраўднасці, а па-другое, дыскрэдытуе архітэктара, таксама як дыскрэдытуе няўдалы жарт старога прафесара. Гэта ўсё ідзе ад таго, што аўтар выбраў нехарактэрныя з'явы з нашага жыцця і паклаў іх у аснову свайго твору. Выпадковыя факты пры абагульненні сказілі совецкую рэчаіснасць. Аўтар апынуўся ў палоне дасціпнага сюжэта і прагледзеў змястоўнасць свайго твору. Безумоўна, трэба высмейваць абывацеляў, якія не ўмеюць выхоўваць дзяцей, але адначасова з гэтым трэба паказаць тых людзей, якія разумеюць наша маладое пакаленне і выхоўваюць іх сапраўднымі будаўнікамі соцыялізма.

У вадэвілі «Не спяшайся, доктар — спаткнешся» Б. Гузарэвіч паўтарыў тую-ж памылку, якую мы ўказалі вышэй. Каб правучыць неўрапатолага Прыгунова, які па сумяшчэнню працуе ў некалькі месцах, аўтар досыць едка высмейвае гэтую «хваробу» ўрача ў сцэна-прыёмнай, а потым шляхам жарту ён хоча канчаткова адвучыць неўрапатолага Прыгунова ад сумяшчэння. Хірург Тапалёў рашыў правучыць Прыгунова і выпісаў яму ілжывы візіт да свайго сваяка рабочага-стаханаўца Токарава, папярэдзіўшы яго, што гэты хворы з'яўляецца вар'ятам. І вопытны неўрапатолаг пападаецца на гэтую вудачку — ён прымае здаровага чалавека за вар'ята. Такі жарт апрача школы ніякай карысці, безумоўна, не дае. З аднаго боку, тут асмейваецца совецкі ўрач, а з другога — тут-жа адбываюцца здзекі над здаровым чалавекам. Гэты эпізод палітычна няправільны, скажаючы соцыялістычную рэчаіснасць, і замест здаровага ўскрыцця недахопаў работы ўрача-сумяшчальніка, атрымліваюцца нейкія смешкі, што зноў-такі ідзе ад адзінічнага факта, а не ад характэрнай з'явы нашай рэчаіснасці. Хірург Тапалёў, які ўзяў на сябе місію выхавацеля Прыгунова, таксама паказаны не станоўчым вобразам, а нейкім дзіваком, які, апрача плоскага жарту з надуманым візітам, нічога лепшага нават не змог прыдумаць. І, нарэшце, праблема сумяшчэння з'яўляецца ўстарэлаю, паколькі наконт гэтага ёсць ясная дырэктыва ўрада, якая забараняе шматлікія сумяшчэнні медыцынскім работнікам. Аб гэтым аўтар нідзе нават не ўпамінае.

Мы лічым, што гэтыя дапрацоўкі аўтару неабходна зрабіць зараз-жа, бо вышэйпамянёныя памылкі маюць прынцыповае значэнне і ад выпраўлення іх твор можа толькі выйграць.

Работнікам часопіса «Полымя рэволюцыі» трэба ўлічыць гэты ўрок. Неабходна з пачынаючымі аўтарамі працаваць. Да таго часу не друкаваць творы, пакуль яны не будуць канчаткова выпраўлены. Калі работнікі не могуць справіцца з гэтай работай, трэба прыцягнуць кваліфікаваных драматургаў з драмсекцыі ССПБ. Нам вядома, што творы тав. Гузарэвіча кансультыравалі кваліфікаваныя драматургі, але, як мы бачым, яны не давялі сваёй справы да канца. Пажадана, каб гэтыя вадэвілі былі абгаворваны на сходзе драматургаў і пісьменнікаў.

А. ЕСАКОЎ.

Удзельнікі чырвонаармейскай самадзейнасці. Злева направа: Н. М. Малышава, І. Г. Аспідаў, Н. А. Дакукіна і С. В. Дрэчын.

ПА МАСКОЎСКІХ ЛІТАРАТУРНЫХ ВЫСТАЎКАХ

Выстаўкі — літаратурныя, мастацкія, гістарычныя, абаронныя — заўсёды былі ў цэнтры ўвагі совецкай грамадскасці нашай слаўнай Масквы. Масквічы ў арганізацыі выставак, якія асвятляюць вялікія падзеі, адлюстроўваюць юбілей і дату, служылі і служаць прыкладам для ўсяго Совецкага Саюза.

І цяпер Масква багата выстаўкамі вялікага мастацкага значэння. Масква паказвае цудоўныя палотны славутага пушкінскага партрэтыста Кіпрэнскага, аднаго з лепшых сусветных майстроў партрэтнага жывапісу. У цэнтры ўвагі масквічоў ужо даўно адкрытая, але карыстаючаяся ўсё тым-жа поспехам цудоўная выстаўка нашага вялікага пейзажыста, спевака рускай прыроды І. Левітана. Вельмі добра наведваецца выстаўка макетаў панарамы гістарычнага перакопскага бою.

Літаратурных выставак у Маскве некалькі. Дзяржаўны літаратурны музей заканчвае абсталяванне значнай літаратурнай выстаўкі, прысвечанай «Слову аб палку Ігараву». Можна з упэўненасцю сказаць, што за ўсе 750 год існавання «Слова» гэта будзе найбольш поўная выстаўка. У афармленні выстаўкі прымаюць удзел такія відныя майстры кісці, як А. Герасімаў і Фаворскі. Выстаўка, ужо мяркуючы па тых экспанатах, якія нам удалося агледзець, дае шырокую карціну Русі XI—XII стагоддзяў, адлюстроўвае слаўныя паходы Ігара, паказвае гістарычны жывапіс, ілюструе народныя паданні аб пакрытых глыбокай старадаўнасцю днях.

Заслужаны дзеяч мастацтваў ордэнаносец Герасімаў напісаў для выстаўкі карціну «Стэп», у якую здолеў укласці ўсю прыгожасць рускай прыроды. З арыгіналаў, сабраных на выстаўцы, хочацца адзначыць нестарэючае палатно славутага Васнецова «Пасля бітвы», якое адносіцца да паходу князя Ігара. На выстаўцы поўнасцю прадстаўлен тэкст выдатнай песні-паэмы ў лепшым перакладзе. Вельмі многа рысункаў. Цэлыя стэнды прысвечаны оперы «Князь Ігар» і вобразам, створаным ёю.

Група навуковых работнікаў падбірае для выстаўкі ўсе найбольш важныя друкаваныя выданні, якія датычаць «Слова аб палку Ігараву», а таксама і выданні самой паэмы, пачынаючы з таго часу, калі яна ўпершыню паявілася ў свет у друкаваным выглядзе.

Па суседству з гэтай выстаўкай, у будынку бібліятэкі імя Леніна адкрыта вялікая выстаўка аб Джамбуле. Мы прывыклі да бібліятэчных выставак і часам адносімся да іх вельмі незычліва. Ды ў гэтым і падставы ёсць. Вось і наша менская Дзяржаўная бібліятэка часта наладжвае выстаўкі, але яны павярхоўныя і большай часткай складаюцца з адных газетных выразак. А гэтага-ж вельмі мала.

Выстаўка аб Джамбуле ў Маскоўскай ленінскай бібліятэцы дае поўную, вычарпальную характарыстыку творчасці праслаўленага акына.

Выстаўка разгортвае карціну квітнеючага Совецкага Казахстана. Што можа быць больш пераканаўчым, чым тыя экспанаты, якія паказваюць, што на мове народа стэпаў, на мове казахаў загаварылі Пушкін, Гогаль, Руставелі, Шаўчэнка, Горкі.

Выстаўка пакідае велізарнае ўражанне. Хацелася-б, каб вопыт арганізацыі маскоўскіх літаратурных выставак быў шырока выкарыстан і ў нас, у БССР.

г. Масква.

Е. САДОЎСКІ.

Група ўдзельнікаў VI акруговай алімпіяды чырвонаармейскай мастацкай самадзейнасці.

Злева направа: А. Д. Мудрац, Н. А. Вагін, А. М. Шамоў, В. В. Орлоў, Т. Г. Сплачка і М. А. Олехаў.

Фото Л. Мазелева (СФ).

УСЕСАЮЗНЫ КОНКУРС ДЫРЫЖОРАЎ

У Маскве адбываецца ўсесаюзны конкурс дырыжораў. У конкурсе прымаюць удзел лепшыя дырыжоры рэспублік Совецкага Саюза, — старыя майстры і моладзь, узрошчаная совецкай школай. Ад БССР у конкурсе прымаюць удзел дырыжоры С. В. Ратнер і І. Я. Мусін.

З 46 удзельнікаў конкурса па рашэнню журы дапушчана да ўдзелу ў другім туры шаснаццаць дырыжораў, у тым ліку дырыжоры БССР тт. Ратнер і Мусін.

Зараз адбываецца другі тур. Штодня ў вялікай зале Маскоўскай дзяржаўнай кансерваторыі, дзе выступаюць удзельнікі конкурса, прысутнічаюць музыканты, кампазітары, студэнты кансерваторыі.

23 верасня на конкурсе выступаў адзін з самых маладых удзельнікаў другога туру С. В. Ратнер. Тав. Ратнер у мінулым годзе кончыў на выдатна Ленінградскую дзяржаўную кансерваторыю. Зараз ён — былы выхаванец Гомельскага дзіцячага дома — дырыжор Дзяржаўнага тэатра оперы і балета БССР. У другім туры тав. Ратнер выконваў урывак з музыкі кампазітара Шчэрбачова да фільма «Граза», сімфанічную паэму Чайкоўскага «Франчэска да Рыміні» і акампаніраваў пяты фартэп'янны канцэрт Бетховена.

Другі тур першага Усесаюзнага конкурса дырыжораў. Маладыя дырыжоры (злева направа)! першы рад: Я. С. Эльяшэвіч, М. І. Павармін, К. П. Кандрашын. Другі рад: С. В. Ратнер і В. В. Веліканаў.



СТАРОНКІ З ГІСТОРЫІ ТЭАТРА

А. РАТАТАЕЎ

★ ★ ★

АСНАВАЛЬНІК РУСКАГА ТЭАТРА

Рускі тэатр мае сваю выдатную гісторыю. Яшчэ ў адзінаццатым стагоддзі рускі народ вылучыў з свайго асяроддзя «іграцоў» і «пацешнікаў»— скамарохаў, якія нязменна карысталіся вялікай любоўю гледача.

Гэты скамарошаскі «рух», выкліканы «імкненнем народа да тэатральных дзействаў», дожыўся некалькі стагоддзяў, пакуль ганенні царквы і ўлады не прывялі да ўказа 1648 г., якім цар Аляксей Міхайлавіч спрабаваў ліквідаваць скамарошства, прымяняючы самыя лютыя меры гвалту аж да загаду «біць у батогі» і гнаць у ссылку.

Але ці памёр народны рускі тэатр? Не. Загнаны ў падполле ён працягваў жыць, праяўляючыся ў розных канкрэтных формах.

Асаблівае значэнне ў арганізацыі працэса яго фарміравання адыграў шляхетны корпус, адзіная вышэйшая грамадзянская ўстанова ў Расіі, якая адкрылася ў Пецярбургу ў 1731 годзе. Адной з асноўных задач, пастаўленых перад корпусам, была падрыхтоўка з дваранскай моладзі — каманднага афіцэрскага састава для арміі, вышэйшых чыноўнікаў для дзяржаўнай службы. Апрача ваенных дысцыплін у корпусе выкладаліся: музыка, танцы, маляванне, архітэктура і т. д.

У корпусе арганізуецца «гурток аматараў расійскай славеснасці», у які ўвайшлі як выкладчыкі, так і навучаючыяся, у прыватнасці будучы «паўночны Расін» — першы рускі драматург і дырэктар тэатра Александр Пятровіч Сумарокаў. На занятках гуртка вывучаюць Карнеля, Расіна, Мальера і інш., перакладаюць іх на рускую мову і т. д.

У гэтых умовах ствараецца глеба, на якой у 1747 годзе ўзнікае першы твор рускай сцэнічнай драматургіі — «Хораў» А. П. Сумарокава. Не гледзячы на тое, што ў п'есе яшчэ моцна сказваўся ўплыў французскага класіцызма, ёю зроблен вялікі і надзвычай важны, знамянальны крок на шляху стварэння рускай драмы.

Пастаўленая п'еса мела велізарны поспех. Адзін з першых гісторыкаў рускага тэатра А. Карабанаў пісаў: «Ніхто не меркаваў, што на рускай мове, як на французскай і італьянскай, можна таксама даваць спектаклі і яшчэ на матэрыяле сваёй айчыннай гісторыі». Некаторыя гісторыкі разглядаюць гісторыю рускага тэатра, як тэатра ў асноўным пераймальнага, як тэатра толькі капіруючага нямецкі, французскі і італьянскі тэатры. Гэта абсалютна няверна. Рускі тэатр стварыўся сваім, асаблівым нацыянальным шляхам, у той-жа час пераймаючы ўсё лепшае з сусветнай драматургіі і тэатра.

Следам за Сумарокавым пачынае пісаць п'есы найвялікшы рускі вучоны, выдатны сын рускага народа М. В. Ламаносаў, трагедыя якога «Тамара і Селім» у хуткім часе разыгрываецца ў кадэцкім корпусе. Спектаклі ў корпусе былі закрытыя. На іх дапускалася выключна вялікасвецкая публіка і тым не менш на адным з чарговых спектакляў за кулісамі паявіўся прыгожы, проста апрануты малады чалавек. Гэта быў будучы арганізатар — родапачынальнік прафесіянальнага сталага тэатра — першы актор зямлі рускай — Ф. Г. Волкаў (нарадзіўся 9 лютага 1729 г., памёр 15 красавіка 1763 г.).

Шмат год пасля Волкаў прызнаўся свайму бліжэйшаму сябру і саратніку Нарыкову-Дзмітрыеўскаму: «убачыўшы Нікіту Афанасьевіча Бекетава ў ролі Сінава (з трагедыі Сумарокава «Сінаў і Трувор», я прышоў у такое захапленне, што не ведаў, дзе быў: на зямлі ці ў нябёсах».

Знаходзячыся пад уплывам бачаных ім спектакляў у Пецярбургу, па звароце ў Яраслаўль у 1750 годзе Волкаў арганізуе вакол сябе маладых аматараў тэатра. Цікавы гэты першы склад волкаўскага тэатра. У яго ўваходзілі: Волкаў з братамі, якія з'яўляліся дзецьмі купцоў, Нарыкаў-Дзмітрыеўскі — сын дзячка, Якаў Шумскі—цырульнік, а астатнія ўдзельнікі гэтага першага тэатра былі заводскія і фабрычныя рабочыя. Вось тая аснова, на якой і ўзнік тэатр у Яраслаўлі, з'яўляючыся сапраўдным народным рускім тэатрам.

29 чэрвеня 1750 года жыхары Яраслаўля з цікавасцю і хваляваннем чакалі абяцанае ім купцом Ф. Волкавым «некое лицедейство, крайне диковинное, доселе невиданное». Ф. Волкаў паказваў сабраўшымся ў фабрычным свірны, прыстасаваным пад тэатр, «Эсфір» Ж. Расіна і пастараль «Эўмонд і Берфа».

Захапленням першага гледача — купецтва і рабочага люду—не было канца. Іх захапіла гэта дзіковінная навінка, замыславаты сюжэт афармлення, асабліва воблакі, «якія хадзілі ўверх і ўніз, як сапраўдныя».

Спектаклі сталі паказвацца сістэматычна. Асоб, якія жадалі паглядзець на «кумедыю», было вельмі шмат. Жадаючы задаволіць гэтыя растучыя патрэбы, Ф. Волкаў будуе тэатр і ўводзіць невялікую плату за білет на спектакль—ад 1 да 5 кап. Гэта сведчыць аб тым, што Яраслаўскі тэатр Волкава быў тэатрам агульнадаступным для простага народа. Слава аб яраслаўскіх ліцэдзеях расла і хутка дакацілася да Пецярбурга. Тэатр Ф. Волкава выклікаюць у сталіцу.

І 18 сакавіка 1752 года ў Пецярбургу адбыўся першы спектакль яраслаўцаў. Было паказана «Пакаянне грэшнага чалавека» Дзмітрыя Растоўскага. Спектакль яраслаўцаў быў даволі стрымана прыняты Елізаветай і яе дваром. Ім не імпаніраваў просты, без знешняга блеску, спектакль яраслаўцаў, іх натуральная сцэнічная ігра здавалася ўжо надта простай. Адносіны да спектакляў яраслаўцаў Елізаветы і яе двара былі процілеглымі адносінам да яго шырокага гледача Яраслаўля, які з выключнай цікавасцю адносіўся да ліцадзейства сваіх землякоў.

Для «пультывавання» Волкава з таварышамі іх пасылаюць у шляхетны корпус, дзе ён ва ўпорнай працы навучаецца навукам.

Сваёй таленавітасцю, стараннасцю, выдатнымі адносінамі да вучобы Ф. Волкаў вылучаецца сярод навучаючыхся. Атрымліваемыя грошы ён выдаткоўвае на набыццё шасці «друкаваных трагедый», «двух лексіконаў французскіх і граматыкі», на «Люстра для трагедый і навучанне жэстам» і т. д. Так рыхтаваўся да сваёй гістарычнай ролі Ф. Г. Волкаў, а ў шляхетным корпусе на гэты раз скалачвалася тая аснова, той касцяк, на якіх узнік рускі прафесіянальны сталы тэатр.

У 1756 годзе, 30 жніўня, выдаецца «Именной высочайший указ, данный Сенату, об учреждении Русского театра». Ф. Г. Волкаў становіцца на чале першага прафесіянальнага сталага рускага тэатра.

Прастудзіўшыся на маскарадзе — 4 красавіка 1763 года, на 35-м годзе свайго плённага выдатнага жыцця, памёр выдатны рускі актор — родапачынальнік рускага тэатра Ф. Г. Волкаў.

Значэнне Ф. Волкава ў гісторыі рускага тэатра велізарнае. Ён з'яўляўся цудоўным рознахарактарным акторам, аб чым мы даведваемся ад Штэліна, які пісаў у Санкт-Пецярбургскім весніку, што ён, Волкаў, «з аднолькавай сілай іграў трагічныя і камічныя ролі», а «Русский вестник» паведамляў, што «Волкаў сваім гучным і гарманічным голасам і поўнай страсці ігрой захапляў і суродзічаў і іншакраінцаў».

Волкаву была ўласціва класічная манера ігры. Яркая, таленавітая індывідуальнасць Волкава праяўлялася і ў іншых відах мастацтва. Ён пісаў на лібрэта Сумарокава музыку да першай рускай оперы «Танюша или счастливая встреча», вершы, эпіграмы, накіраваныя супроць тыповых для таго часу франтаў і пустазвонаў, супроць прадстаўнікоў «залатой моладзі», супроць «власть имущих».

Літаратурна - паэтычная дзейнасць Волкава сведчыць аб яго сапраўдных настроях, як выхадца з народа, як выразнiка яго інтарэсаў. У сваіх творах ён выводзіць не адцягненыя, абстрактныя імёны, як гэта мела месца ў драматургіі да яго, а простыя рэальныя, узятыя з жыцця рускага простага народа. Тут і сялянскія дзяўчаты, і прыказныя, і пад'ячыя і т. д. Ён напісаў камедыі «Суд Шемякина», «Всякий Еремей про себя разумей» і т. д. Ім перакладаюцца «Эсфирь» Расіна, «Типово милосердие» і шмат іншых—з французскай, італьянскай і нямецкай моў. Ён добра разумеў, што стварэнне рускага тэатра можа паспяхова ісці толькі на грунце авалодання велізарнейшай сусветнай культурай. Найвялікшая заслуга Волкава яшчэ ў тым, што ён знаёміць, выхоўвае гледача на лепшых узорах сусветнай драматургіі—Мальера, Расіна і т. д.

Біограф Ф. Волкава — Новікаў пісаў аб ім: «Тэатральнае мастацтва ведаў ён у вышэйшай ступені; прычым быў добры вершатворац, добры жывапісец, досыць умелы музыкант на іншых інструментах, пасрэдны скульптар, і, адным словам, чалавек многіх ведаў у дастатковай ступені».

Арганізаваны Волкавым тэатр з'яўляецца найярчэйшым выразнікам рускага нацыянальнага пачуцця. Народнасць выдатнай і рознабаковай дзейнасці аснавальніка рускага тэатра пранізвае ўсю яго таленавітую дзейнасць. Тыя велізарныя заслугі, якія мае Ф. Волкаў, ставяць яго ў адну групу, у адзін рад лепшых людзей Расіі, якія з'яўляюцца нацыянальнай гордасцю рускага народа.

Найвялікшым прадаўжальнікам справы Ф. Волкава з'явіўся яго бліжэйшы друг і саратнік, буйнейшы рускі актор—Нарыкаў-Дзмітрыеўскі.

Царская Расія не ацаніла, ды і не магла ацаніць тую велізарную ролю, якую адыграў Ф. Г. Волкаў у гісторыі рускага тэатра. Найвялікшы рускі крытык Вісарыён Грыгор'евіч Бялінскі пісаў: «Ці хутка, думалі мы, у рускіх зацвердзіцца поўная павага да саміх сябе, да свайго роднага, без нянавісці і варожага прыстрасця да ўсяго вартага павагі ў іншакраінцаў? А гэты геніяльны рывок, гэта дзіўная з'ява, якой мала роўных у гісторыі чалавецтва?... А гэты сын купца, пасынак скуранога заводчыка, бацька рускага тэатра?....».

З'яўляючыся выдатным сынам сваёй радзімы, В. Г. Бялінскі абураецца, што чыноўна - дваранская буржуазная Расія забыла родапачынальніка рускага нацыянальнага тэатра, з горыччу, здзекуючыся над існаваўшым прагнічым ладам, гаворыць: «Вось, напрыклад, гэты Волкаў — быў-бы ён іншакраінцам, яго суродзічы даўно-б выкарысталі яго жыццё на трагедыі, камедыі і драмы,, оперы, вадэвілі, раманы, аповесці, казкі; а ў нас няма нават поўнай яго біяграфіі, таму, што няма дзе ўзяць фактаў аб падрабязнасцях яго жыцця, а многія не ведаюць яго і імя».

У 1888 годзе, у гадавіну нараджэння Волкава, 9 лютага, антрэпрэнёр яраслаўскага тэатра даў спектакль, з якога частка збору прызначалася на помнік Волкаву. Гэтая частка выразілася ў суме 32 рублі... Урад Александра III, куды звярнуліся губернскія ўлады за дапамогай, знайшоў, што заслугі Ф. Волкава ўжо не такія вялікія, каб яму ставіць помнік.. Якія цынічны, які гнусны здзек над светлай памяццю першага рускага актора Ф. Г. Волкава. Толькі наша вялікая соцыялістычная рэволюцыя аддала патрэбнае Ф. Волкаву, толькі пасля рэволюцыі тэатр у Яраслаўлі названы яго імем.

Сцяг рускага нацыянальнага тэатра, высока ўзняты Ф. Волкавым, знайшоў сваіх бліскучых прадаўжальнікаў. Гэты сцяг пранесен праз многія дзесяцігоддзі найвялікшымі акторамі Расіі — Дзмітрыеўскім, Шчэпкіным і многімі іншымі. На недасягальную вышыню ён узняты нашым совецкім тэатрам — лепшым тэатрам свету. Толькі наша краіна з'яўляецца вартай успрыймальніцай і адзінай наследніцай усіх багаццяў, сабраных нашым народам. Нідзе няма такіх шырокіх магчымасцей, такіх выдатных умоў для творчай работы, які'я ў нашай краіне прадастаўлены работнікам тэатра нашым урадам, партыяй Леніна — Сталіна, якія беражна і любоўна расцяць наша цудоўнае мастацтва.

Імя Ф. Г. Волкава залатымі літарамі напісана на старонках гісторыі рускага тэатра, з'яўляючыся нацыянальным гонарам нашага совецкага народа.

Нам. адказнага рэдактара А. Р. ВАРАШЫЛАЎ.

Друкарня «Звязды». Газета выходзіць раз у пяцідзёнку. Адрэс рэдакцыі газеты: Менск, Совецкая, 76, Дом пісьменніка. Тэлефон 25-394. Уп. Галоўлітбела № К—5680.